Дэпартамент па архівах і справаводству
Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь

Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі

Дзяніс Лісейчыкаў

# Святар

## у беларускім соцыуме

### Прасапаграфія ўніяцкага духавенства 1596 –1839 гг.

Мінск
«Беларусь»
2015

УДК [94+271.4-725](476)“1596/1839”
ББК 63.3(4Беи)4
Л63

Рэкамендавана да друку Вучоным саветам
Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі

Р э ц э н з е н т ы:
доктар габілітаваны, прафесар *Анджэй Гіль,*
доктар гістарычных навук, прафесар *Ігар Скачыляс,*
доктар гісторыі (Ph.D.), дацэнт *Барбара Скінэр*

Праца выканана ў рамках планавай навуковай тэмы
Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі
«*Дакументы па гісторыі ўніяцкіх святарскіх родаў беларуска-літоўска-латышскіх зямель 1596–1839 гг.*»

*Выпуск выдання ажыццёўлены па заказу і пры фінансавай падтрымцы Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь*

**Лісейчыкаў, Д. В.**

Л63 Святар у беларускім соцыуме : прасапаграфія ўніяцкага духавенства 1596–1839 гг. / Дзяніс Лісейчыкаў. — Мінск : Беларусь, 2015. — 719 с., [16] л. іл.

ISBN 978-985-01-1138-8.

У кнізе разглядаецца гісторыя фарміравання сацыяльнага пласта (страты) уніяцкага духавенства беларуска-літоўска-латышскіх зямель у XVI–XIX стст. У аснову даследавання пакладзены метад прасапаграфіі — стварэнне т. зв. калектыўных біяграфій. Біяграфічныя артыкулы ўтрымліваюць звесткі аб жыцці і дзейнасці 8480 прадстаўнікоў духавенства ў 1826 парафіях. Для напісання працы былі выкарыстаны дакументы і матэрыялы з архівасховішчаў Беларусі, Латвіі, Літвы, Польшчы і Расіі.

Разлічана на гісторыкаў, архівістаў, выкладчыкаў, студэнтаў, краязнаўцаў і ўсіх, хто цікавіцца пытаннямі канфесійнай гісторыі Беларусі, сацыяльнай гісторыі і генеалогіі.

**УДК [94+271.4-725](476)“1596/1839”**
**ББК 63.3(4Беи)4**

**ISBN 978-985-01-1138-8**

© Дзяржаўная ўстанова «Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі», 2015
© Выдавецтва «Беларусь», 2015

# ЗМЕСТ

Спіс скарачэнняў і ўмоўных пазначэнняў . . . . . 4

**УВОДЗІНЫ**

Метадалогія, гістарыяграфія і агляд крыніц . . . . . 5

Сістэматызацыя і аналіз крыніц . . . . . 14

**ЧАСТКА I**

**Раздзел I. УНІЯЦКАЕ СВЯТАРСТВА Ў САЦЫЯЛЬНАЙ СТРУКТУРЫ ГРАМАДСТВА**

1. Фарміраванне святарскіх дынастый . . . . . 20
2. Кар'ера, адукацыя, сям'я . . . . . 28

**Раздзел II. СТАСУНКІ З ІЕРАРХІЯЙ І СВЕЦКАЙ УЛАДАЙ**

1. Стасункі па лініі «святар — калятар» . . . . . 46
2. Стасункі па лініі «святар — епіскап» . . . . . 53

**Раздзел III. ЛАКАЛІЗАЦЫЯ СВЯТАРСКІХ РОДАЎ**

1. Епархія — дэканат — парафія: заснаванне, скасаванне, вызначэнне меж . . . . . 61
2. Асаблівасці фарміравання парафіяльнай і дэканацкай сеткі ў Полацкай архіепархіі ў 1772–1793 гг. . . . . . 71

**Раздзел IV. КАНФЕСІЙНЫЯ КАНВЕРСІІ І ЗМЕНА АБРАДУ СВЯТАРАМІ**

1. Канверсіі «унія — праваслаўе» і наадварот . . . . . 75
2. Пераход з усходняга абраду ў лацінскі і наадварот . . . . . 83

**ЗАКЛЮЧЭННЕ** . . . . . 92

**ПАДЗЯКІ** . . . . . 94

**ЧАСТКА II**

**I. БІЯБІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ АРТЫКУЛЫ** . . . . . 95

Спіс выкарыстаных крыніц . . . . . 594

**II. НАВУКОВА-ДАВЕДАЧНЫ АПАРАТ**

1. Асабовы паказальнік . . . . . 612
2. Геаграфічны паказальнік . . . . . 643
3. Хранал агічны паказальнік . . . . . 711

**ABSTRACT** . . . . . 719

## СПІС СКАРАЧЭННЯЎ І ЎМОЎНЫХ ПАЗНАЧЭННЯЎ

* — нарадзіўся;

† — памёр;

1 v. — primum votum (*лацінск.* першы шлюб). Гл. таксама v.;

2 v. — secundum votum (*лацінск.* другі шлюб) Гл. таксама v.;

APL — Archiwum Państwowe w Lublinie (*польск.* Дзяржаўны архіў у Любліне);

ap. — apyrašas (*літоўск.*), apraksts (*латышск.*) — вопіс;

b. — byla (*літоўск.* справа);

f. — fondas (*літоўск.*), fonds (*латышск.*) — фонд;

l. — lapas (*літоўск.* аркуш), lieta (*латышск.* справа);

LMAB — Lietuvos mokslų akademijos Vrublevskių biblioteka (*літоўск.* Бібліятэка Акадэміі навук Літвы імя Урублеўскіх);

LVIA — Lietuvos valstybės istorijos archyvas (*літоўск.* Дзяржаўны гістарычны архіў Літвы);

LVVA — Latvijas valsts vēstures arhīvs (*латышск.* Дзяржаўны гістарычны архіў Латвіі);

s. — strona (*польск.* старонка);

sygn. — sygnatura (*польск.* сігнатура);

v. — votum (*лацінск.* шлюб). Гл. таксама 1 v., 2 v.;

z. — zespół (*польск.* фонд);

АВАК — Акты, издаваемые Виленскою археографическою комиссиею;

АЗР — Акты, относящиеся к истории Западной России, собранные и изданные Археографическою Комиссиею;

АМДАС — Архіў Мінскай духоўнай Акадэміі і Семінарыі (в. Жыровічы Слонімскага р-на Гродзенскай вобл.);

арк. — аркуш;

АСДСЗР — Археографический сборник документов, относящихся к истории Северозападной Руси, издаваемый при Управлении Виленскаго Учебнаго Округа;

АЦР — Архіў царквы ў м. Ракаў (сёння в. Ракаў Валожынскага р-на Мінскай вобл.);

в. — вёска;

в.а. — выконвае абавязкі;

вакол. — ваколіца;

ваяв. — ваяводства;

ВКЛ — Вялікае Княства Літоўскае;

воп. — вопіс;

г., гг. — год/горад, гады/гарады;

губ. — губерня;

д. — дело (*руск.* справа);

КМФ — Калекцыя мікрафільмаў;

КП — Каралеўства Польскае;

КПр — Каралеўства Прусія;

м. — мястэчка;

маёнт. — маёнтак;

нар. — народжаная (дзявочае прозвішча);

НГАБ — Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі;

НГАБ у Гродна — Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Гродна;

оп. — опись (*руск.*), опис (*украінск.*) — вопіс;

пав. — павет;

паг. — пагост;

прадм. — прадмесце;

р. — рака;

РГАДА — Российский государственный архив древних актов (*руск.* Расійскі дзяржаўны архіў старажытных актаў);

РГИА — Российский государственный исторический архив (*руск.* Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў);

Св. — святы, святая;

спр. — справа;

ф. — фонд;

фальв. — фальварак;

ЦДІАК України — Центральний державний історичний архів України у м. Києві (*украінск.* Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў Украіны ў г. Кіеве);

ЯКМ — Яго Каралеўская Міласць.

# УВОДЗІНЫ

## Метадалогія, гістарыяграфія і агляд крыніц

Вывучэнню ролі духавенства ў фарміраванні інтэлектуальнай эліты грамадства беларуска-літоўскіх зямель да сённяшняга часу не надавалася належнай увагі. Між тым менавіта духавенства, перадусім уніяцкае, у першай чвэрці XIX ст. служыла своеасаблівым «пастаўшчыком» дзеячаў, без якіх немагчыма ўявіць гісторыю грамадска-палітычнага руху, навукі і культуры XIX ст. Агульнавядома і тое, што выхадцы з уніяцкіх святарскіх дынастый зрабілі значны ўнёсак у стварэнне і фарміраванне т. зв. ідэалогіі «заходнерусізму» — найбуйнейшай гістарыяграфічнай і грамадска-палітычнай плыні XIX ст. на беларуска-літоўскіх землях[1]. Сярод выхадцаў з сем'яў уніяцкіх святароў ёсць цэлы шэраг знакавых асоб у культурным жыцці беларуска-літоўскіх зямель XIX ст. Да іх ліку належаць: гісторык і архівіст, прафесар Віленскага ўніверсітэта **Ігнат Анацэвіч**; аграбіёлаг і эканаміст **Міхал Ачапоўскі**; прафесар Віленскага ўніверсітэта, доктар тэалогіі, славіст і арыенталіст **Міхал Баброўскі**; пісьменнік і выдавец, адзін з заснавальнікаў новай беларускай літаратуры **Ян Баршчэўскі**; філолаг **Антон Будзіловіч**; архівіст і археограф **Міхал Вяроўкін**; гісторык і археолаг **Ксенафонт Гаворскі**; доктар медыцыны і гісторык **Міхал Гамаліцкі**; прафесар Віленскага і Харкаўскага ўніверсітэтаў, гісторык і правазнаўца **Ігнат Даніловіч**; прафесар Санкт-Пецярбургскага ўніверсітэта, санскрытолаг **Каятан Касовіч**; прафесар Санкт-Пецярбургскай духоўнай акадэміі, гісторык і публіцыст **Міхал Каяловіч**; гісторык і краязнаўца **Сямён Лісіцкі**; выдавец і публіцыст **Антон Марціноўскі**; этнограф і фальклярыст **Мікалай Нікіфароўскі**; паэт і публіцыст, заснавальнік «Дэмакратычнага таварыства» ў Віленскай Медыка-хірургічнай акадэміі **Францішак Савіч**; мастак **Іван Хруцкі**; паэт, перакладчык, фальклярыст, выдавец **Ігнат Шыдлоўскі** і многія іншыя.

У XIX ст. уніяцкае духавенства ўяўляла сабой даволі закрытую сацыяльную групу насельніцтва, у якой на працягу вялікага прамежку часу склаліся ўнікальныя нормы паводзін, выхавання дзяцей і вядзення гаспадаркі. Парафіяльны святар, як асноўны транслятар здабыткаў кніжнай культуры, займаў важнае месца ў беларускім соцыуме XVI–XIX стст. Акрамя прамых душпастырскіх абавязкаў менавіта святар выконваў ролю ўтрымальніка бібліятэк і парафіяльных школак. Вывучэнню штодзённага жыцця ўніяцкага духавенства ўжо была прысвечана адна з папярэдніх прац[2]. Аднак выкарыстанне метадаў даследавання, уласцівых вывучэнню гісторыі штодзённасці, не ў стане ў дастатковай ступені асвятліць шэраг важных аспектаў у фарміраванні гэтай сацыяльнай групы. Сярод такога кшталту праблем асабліва варта вылучыць узнікненне і функцыянаванне святарскіх дынастый, лакалізацыю святарскіх родаў, стасункі з іерархіяй і свецкай уладай, канфесійныя канверсіі і змену абраду. Асноўная задача гэтага даследавання вывучыць названыя пытанні з выкарыстаннем метадаў *прасапаграфіі*.

**Прадметам даследавання** з'яўляецца асабовы склад уніяцкага духавенства беларуска-літоўска-латышскіх зямель.

**Храналагічныя межы даследавання** — 1596–1839 гг., ад моманту заключэння Брэсцкай царкоўнай уніі да моманту яе скасавання на тэрыторыі т. зв. «Заходніх губерняў» Расійскай імперыі.

---

[1] Да найбольш вядомых прац, створаных у рэчышчы канцэпцыі «заходнерусізма», можна аднесці наступныя: Бобровский П. Русская греко-униатская церковь в царствование Александра I-го. — СПб. : тип. В. С. Балашева, 1890; Киприанович Г. Исторический очерк православия, католичества и унии в Белоруссии и Литве с древнейшаго до настоящаго времени. — Вильна, 1895; Коялович М. Литовская церковная уния. — Т. I. — СПб. : Типография Н. Тихменева, 1859; Ён жа. Литовская церковная уния. — Т. II. — СПб. : В типографии духовного журнала «Странник», 1861; Ён жа. История возсоединения западнорусских униатов старых времен. — СПб. : В Типографии Второго Отделения Собственной Е. И. В. Канцелярии, 1873; Рункевич С. История Минской архиепископии (1793–1832 гг.) с подробным описанием хода возсоединения западнорусских униатов с православною церковью в 1794–1796 гг. — СПб. : Тип. А. Катанского и К°, 1893; Шавельский Г. Последнее возсоединение с православною церковию униатов Белорусской епархии (1833–1839 гг.). — СПб. : Типография «Сельскаго Вестника», 1910 і інш.

[2] Лісейчыкаў Д. Штодзённае жыццё ўніяцкага парафіяльнага святара беларуска-літоўскіх зямель 1720–1839 гг. — Мінск : Медысонт, 2011. (Гл. таксама электронны рэсурс. Рэжым доступу: http://kamunikat.org/usie_knihi.html?pubid=20881)

**Тэрытарыяльныя межы даследавання** можна акрэсліць умоўным тэрмінам *беларуска-літоўска-латышскія землі*. Гэтае паняцце ахоплівае тэрыторыю т. зв. «Літоўскай» часткі Кіеўска-Віленскай мітрапаліцкай епархіі[3], Полацкай архіепархіі, Пінска-Тураўскай епархіі і Брэсцкага афіцыялату Уладзімірска-Брэсцкай епархіі паводле стану на сярэдзіну XVIII ст. Гэтыя межы ахопліваюць землі былога Вялікага Княства Літоўскага, Падляшскага ваяводства Каралеўства Польскага (Бельскі, Драгічынскі і Мельніцкі паветы), а таксама Інфлянты і Курляндыю — а канкрэтна тыя іх рэгіёны, дзе пражывала ўсходнеславянскае насельніцтва і мелася разгалінаваная сетка ўніяцкіх парафій.

Пасля трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай у 1795 г. епархіяльныя межы не аднойчы мяняліся, і разглядаемыя тэрыторыі ўваходзілі ў склад наступных епархій: Полацкай (з 1828 г. — Беларускай), Супрасльскай (1797–1809 гг.), Брэсцкай (1798–1828 гг.), Літоўска-Віленскай мітрапаліцкай (1809–1828 гг.) і Літоўскай (1828–1839 гг.) Да таго ж у сярэдзіне XVII ст. уніяцкія цэрквы на самым усходзе разглядаемай тэрыторыі пэўны час уваходзілі ў склад Смаленскай архіепархіі (1625–1667 гг.)[4].

Асобныя тэрыторыі да 1795 г. не ўваходзілі ў склад названых епархій і патрапляюць у зададзеныя тэрытарыяльныя межы дадзенага даследавання толькі пасля далучэння навакольных земель да Расійскай імперыі. Каб не парушыць пераемнасць у вывучэнні асабовага складу і парафіяльнай разбудовы на гэтых тэрыторыях уяўляецца мэтазгодным уключыць у кнігу звесткі аб іх і за перыяд ранейшы, чым 1795 г. Паколькі такіх тэрыторый няшмат, пададзім іх поўны пералік. Гэта паўночная частка Ратненскага дэканата Холмскай епархіі (парафія ў в. Цыр з 1795 г. увайшла ў склад Пінскага пав., цэнтры яшчэ 3-х парафій (Лелікава, Павіцце і Радастава), што знаходзяцца на тэрыторыі сённяшняй Рэспублікі Беларусь, пасля 1795 г. увайшлі ў склад Ковельскага пав. Валынскай губ.). Некалькі цэркваў у раёне м. Брагін (м. Брагін, Лоеў, Хойнікі, в. Бабчын, Белая Сарока, Глухавічы, Грушнае, Дзёрнавічы, Ёлча, Макрэц, Мікулічы, Стралічаў, Храковічы, Чыкалавічы) адносіліся да т. зв. «Кароннай» часткі Кіеўска-Віленскай епархіі (пасля 1795 г. тэрыторыя ўвайшла ў склад Рэчыцкага пав. Мінскай губ.). Царква ў в. Пнёўна, што належала да Уладзімірскага афіцыялату Уладзімірска-Брэсцкай епархіі, у 1795 г. апынулася ў складзе Пінскага пав. Мінскай губ.

Абсалютная большасць разглядаемых у працы тэрыторый у адзначаны перыяд уваходзіла ў склад 2-х дзяржаў — Рэчы Паспалітай і Расійскай імперыі. Невялікая колькасць цэркваў у раёне г. Гродна (у тым ліку м. Галынка і Сапоцкін, в. Баля, Лабна і Перстунь на тэрыторыі сучаснай Рэспублікі Беларусь) у 1797–1809 гг. увайшла ў склад Супрасльскай епархіі, якая аб'яднала ўніяцкія цэрквы, што ў выніку трэцяга падзела Рэчы Паспалітай на нядоўгі час апынуліся ў складзе Каралеўства Прусіі (т. зв. «Новая Усходняя Прусія»). У 1807–1815 гг. яны ўваходзілі ў склад Герцагства Варшаўскага, у 1815–1837 гг. — Аўгустоўскага ваяв. Каралеўства Польскага (з 1837 г. — Аўгустоўскай губ.). Некалькі дзясяткаў парафій былой Уладзімірска-Брэсцкай епархіі (пераважна Уладаўскага і Бельскага (Бяльскага) дэканатаў) пасля трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай на нядоўгі час апынуліся ў складзе Аўстрыі (т. зв. «Новая Галіцыя»). Абсалютная большасць з іх знаходзілася на тэрыторыі Бельскага (Бяльскага) цыркула, а пасля рэформы адміністрацыйна-тэрытарыяльнага кіравання ў 1803 г. — на тэрыторыі цыркула Уладаўскага. У 1809 г. пасля польска-аўстрыйскай вайны гэтыя тэрыторыі ўвайшлі ў склад Герцагства Варшаўскага, у 1815–1837 гг. — Падляшскага ваяв. Каралеўства Польскага (з 1837 г. — Падляшскай губ.).

Спецыфіка адзначаных земель у тым, што ўніяцкая царква тут была скасавана не ў 1839 г., як у т. зв. «Заходніх губернях» Расійскай імперыі, а толькі ў 1875 г. Але гэты перыяд ужо выходзіць за храналагічныя межы дадзенага даследавання, таму звесткі аб святарах на гэтых тэрыторыях абмежаваны ў кнізе 30-мі гадамі XIX ст.

---

[3] Тэрмін Кіеўска-Віленская па сутнасці з'яўляецца гістарыяграфічным канструктам. У крыніцах да другой паловы XVIII ст. епархія называецца проста Кіеўскай. Аднак назва Кіеўска-Віленская апошнім часам стала замацоўвацца ў сучаснай гістарыяграфіі як больш адпаведная рэальнаму стану рэчаў, паколькі г. Кіеў з 1667 г. адышоў да Маскоўскай дзяржавы, а фактычным цэнтрам епархіі з'яўляўся г. Вільня.

[4] Пасля ўваходжання абсалютнай большасці тэрыторыі Смаленскага ваяводства ў склад Маскоўскай дзяржавы ў 1667 г. рэшта земель увайшла ў склад Віцебскага ваяводства, а ўніяцкія цэрквы на гэтай тэрыторыі сталі дэ-факто падпарадкоўвацца полацкім архіепіскапам. Пасада тытулярнага смаленскага архіепіскапа захоўвалася і надалей. Апошні тытулярны смаленскі архіепіскап Іосіф Лапкоўскі памёр у 1778 г.

**Метадалогія і гістарыяграфія**. Як адзначалася вышэй, у аснову правядзення даследавання быў пакладзены метад *прасапаграфіі*. *Прасапаграфія* (ад грэц. *πρόσωπον* — «асоба» а і *γράφω* — «пішу») — метад стварэння калектыўных біяграфій, які заключаецца ў выяўленні пэўнага кола асоб і ў пастаноўцы ў адносінах да іх шэрагу аднатыпных пытанняў (даты нараджэння, шлюбу, смерці, месца жыхарства і працы, адукацыі, сацыяльнага паходжання і г. д.) Як правіла, гэты метад найбольш прыдатны для вывучэння эліт. Калі назбіраць даволі вялікую колькасць біяграфій, то можна скласці ўяўленне аб сацыяльнай групе ў цэлым[5].

Хоць сам тэрмін *прасапаграфія* ўжываўся яшчэ ў XVI ст., у якасці асобнага метаду гістарычнага даследавання ён пачаў выкарыстоўвацца толькі ў другой палове XIX ст.[6] Ён набыў пэўную папулярнасць у 20-я гг. XX ст., але метадалагічная канцэпцыя была больш дасканала распрацавана навукоўцамі ўжо ў 70-я гг. XX ст.

На думку англійскага гісторыка і сацыёлага Л. Стоўна, прасапаграфія — гэта даследаванне агульных характарыстык групы дзейных асоб, якое датычыць дзвюх асноўных праблем: «*1) шляхоў здзяйснення імі палітычных акцый; 2) шляхоў і варыянтаў сацыяльнай мабільнасці і рэалізацыі сваіх кар'ерных памкненняў*»[7]. Да вывучэння ў межах метадалогіі прасапаграфіі, як правіла, абіраецца група асоб, звязаных аднолькавым родам дзейнасці альбо займаннем аналагічных пасад, прыналежнасцю да пэўнага перыяду альбо агульнай сувяззю з пэўным чалавекам (вучні вядомага настаўніка) і інш.

Англійская даследчыца А. Герытсэн у сваім артыкуле[8] вылучае тры асноўныя падыходы ў разуменні метадалагічных прынцыпаў прасапаграфіі, якія склаліся ў гістарычнай навуцы на сённяшні дзень. Іх можна ўкласці ў наступную схему: 1) стварэнне біяграфічных артыкулаў пэўнай групы асоб; 2) стварэнне аналітычных прац на аснове гэтых артыкулаў; 3) адасабленне ў калектыўнай біяграфіі агульных рысаў ад індывідуальных. Так, у якасці прыклада першага падыходу прыводзіцца праца Д. Нэйлс «*The People of Plato: A Prosopography of Plato and Other Socratics*»[9]. У гэтай кнізе скрупулёзна сабраны звесткі аб усіх асобах, якія ўзгадваюцца ў дыялогах старажытнагрэцкага філосафа Платона (з т. зв. *Corpus Platonicum*) — кароткі жыццяпіс, кар'ера, сям'я, вядомыя творы. Такім чынам, сістэматызаваныя даследчыцай звесткі робяць магчымым далейшы прасапаграфічны аналіз. Менавіта тут, як заўважае А. Герытсэн, узнікае другое, «прыкладное», значэнне прасапаграфічнага метаду — правядзенне асобнага даследавання на падставе працы, створанай паводле прынцыпаў прасапаграфіі. Гэта могуць быць, напрыклад, любыя віды анамастычных даследаванняў — вывучэнне імёнаў уласных і інш. Якраз аб гэтым разуменні сутнасці прасапаграфічнага метаду пісаў Л. Стоўн у сваім артыкуле, аб якім гаварылася вышэй. Урэшце, трэцяе значэнне сутнасці метаду прасапаграфіі заключаецца ў тым, каб выявіць тыя біяграфічныя характарыстыкі асоб, што сведчаць аб іх прыналежнасці да пэўнай сацыяльнай групы, а не тыя, што вылучаюць іх індывідуальнасць. Менавіта так інтэрпрэтуе сутнасць прасапаграфіі даследчык гісторыі ісламскага свету Ч. Ф. Робінсан[10].

Прасапаграфічны метад часта напрамую атаясамляюць з біяграфічным. Нават у сучаснай «*Новой философской энциклопедии*»[11] ён адзначаны ў якасці аднаго з падвідаў біяграфічнага метаду. Аднак, як падаецца, адрозненні паміж імі відавочныя. Як правільна адзначыла нідэрландская даследчыца

---

[5] Дюма Ж. Об изучении элит в современной историографии // Французский ежегодник. — М., 2001. — С. 136.

[6] Гл. напрыклад: Babelon E. Description historique et chronologique des monnaies de la République Romaine, vulgairement appellées monnaies consulaires. — T. 1. — Paris : Rollin et Feuardent, 1885; Boissier G. Cicero and His Friends: A Study of Roman Society in the Time of Caesar. — London, 1897; Kirchner J. Prosopographia Attica. — Volumen Alterum. — Berlin : Typis et impensis Georgii Reimeri, 1901 і інш.

[7] Stone l. Prosopography // Historical Studies Today / Ed. by F. Gilbert and St. Graubard. — New York : W. W. Norton, 1972. — P. 107.

[8] Gerritsen A. Prosopography and its Potential for Middle Period Research // Journal of Song-Yuan Studies. — Volume 38. — Middlebury, 2008. — P. 161–201.

[9] Nails D. The People of Plato: A Prosopography of Plato and Other Socratics. — Indianapolis : Hacket Pub., 2002.

[10] Robinson Ch. F. Islamic Historiography. — Cambridge : Cambridge University Press, 2002.

[11] Биографический метод // Новая философская энциклопедия. — Т. 1. [Электронный ресурс]. — М. : Мысль. — Режим доступа: http://iph.ras.ru/elib/0412.html — Дата доступа: 31.05.2014.

А. Берэнс, для таго, «*каб атрымаць адказ на пэўнае пытанне аб калектыве, зусім не патрэбна мець поўную біяграфію кожнага індывідуума*»[12]. Не без гумару яна піша, што для вывучэння сацыяльнага паходжання лонданскіх піваvараў у XVII ст. мы ў ходзе даследавання павінны ўстанавіць ці з'яўляўся чалавек лонданскім піваварам і якое ў яго было сацыяльнае паходжанне — для гэтага нам не патрэбны дакладныя звесткі аб нараджэнні і смерці і ці шчаслівым быў чалавек у шлюбе[13].

Як слушна сцвярджае літоўскі даследчык Р. Пятраўскас, «*яшчэ адна перавага гэтага* (прасапаграфічнага. — *Д. Л.*) *метаду ў тым, што ён вымагае збору звестак пра ўсіх асоб са складу сацыяльнай групы, якая з'яўляецца прадметам даследавання, а не толькі пра найбольш значных яе прадстаўнікоў. Такім чынам, можна атрымаць нашмат больш універсальныя высновы пра становішча сацыяльнай групы*»[14]. Да найбольш вядомых прац, выкананых з дапамогай прасапаграфічнай метадалогіі, можна аднесці трохтомнае выданне «*The Prosopography of the Later Roman Empire*»[15], складзенае Дж. Р. Мартындэйлам і А. Х. М. Джонсам пад агульнай рэдакцыяй апошняга, прысвечанае асобам, якія жылі альбо як быццам бы жылі ў т. зв. «Рымскім свеце» з 260 па 641 г. н.э. Як працяг гэтага праекта быў створаны электронны банк дадзеных прасапаграфіі жыхароў т. зв. «Візантыйскага свету» за перыяд з 642 па 1261 г.[16] Навукоўцамі Лонданскага каралеўскага каледжа ў супрацоўніцтве з Кембрыджскім універсітэтам быў створаны прасапаграфічны банк дадзеных «*Prosopography of Anglo-Saxon England*», які ўтрымлівае звесткі аб жыхарах англа-саксонскай Англіі 567–1066 гг.[17].

Прасапаграфічны метад паспяхова выкарыстоўвалі і пры вывучэнні асабовага складу духавенства. З 1969 па 2004 гг. англійскім даследчыкам Дж. М. Хорнам пры ўдзеле Д. М. Сміта, Д. Ш. Бэйлі, П. Масэта былі падрыхтаваны 11 тамоў даведніка «*Fasti Ecclesiae Anglicanae 1541–1857*», які ўтрымлівае біяграфіі і апісанні кар'еры епіскапаў і вышэйшага кліру англіканскай царквы з сярэдзіны XVI да сярэдзіны XIX ст. На падставе гэтай працы на цяперашні момант створаны банк дадзеных «*Clergy of the Church of England database*»[18], які ўтрымлівае звесткі па 150 000 персаналіях. Сярод найноўшых прац, напісаных з выкарыстаннем метадалогіі прасапаграфіі, якія тычацца духавенства Рэчы Паспалітай, можна вылучыць кнігі польскіх гісторыкаў Я. Шчэпаняка «*Duchowieństwo diecezji krakowskiej w XVIII wieku. Studium prozopograficzne*»[19] і Д. Вярэды «*Biskupi unickiej metropolii kijowskiej w XVIII wieku*»[20].

У апошні час прасапаграфічны метад крытыкуецца за тое, што праца даследчыка зводзіцца да простага назапашвання фактаграфічнага матэрыялу. Гэта якраз тое першае разуменне метаду прасапаграфіі, аб якім пісала А. Герытсэн у згаданым вышэй артыкуле[21]. Найбольш яскравым прыкладам такога падыходу ў даследаваннях, прысвечаных вывучэнню асабовага складу духавенства, з'яўляецца праца польскіх даследчыкаў Г. Сасны і А.Троц-Сасны «*Hierarchia i kler kościoła prawosławnego w granicach II Rzeczypospolitej i Polski powojennej w XIX–XXI wieku*»[22]. Кніга ўтрымлівае больш за 20 000 біяграм

[12] Beerens A. Friends, Acquaintances, Pupils, and Patron. Japanese Intellectual Life in the Late Eighteenth Century: A Prosopographical approach. — Leiden : Leiden University Press, 2006. — P. 40.

[13] Ibidem.

[14] Пятраўскас Р. Літоўская знаць у канцы XIV–XV ст.: Склад — структура — улада / Рымвідас Пятраўскас; пераклад з літоўскай мовы Алесь Мікус. — 2-е выд. — Смаленск : Інбелкульт, 2014. — С. 26.

[15] Jones A.H.M., Martindale J.R., Morris J. The Prosopography of the Later Roman Empire. — Volume I. — A.D. 260–395. — Cambridge : Cambridge University Press, 1971; Martindale J. R. The Prosopography of the Later Roman Empire. — Volume II. — A.D. 395–527. — Cambridge : Cambridge University Press, 1980; Martindale J. R. The Prosopography of the Later Roman Empire. — Volume III. — A.D. 527–641. — Cambridge : Cambridge University Press, 1992.

[16] Prosopography of the Bizantine World. [Электронны рэсурс]. — London : King's College London, 2011. — Рэжым доступу: http://www.pbw.kcl.ac.uk/ — Дата доступу: 29.05.2014.

[17] Prosopography of Anglo-Saxon England. [Электронны рэсурс]. — London : King's College London, 2010. — Рэжым доступу: http://www.pase.ac.uk/index.html — Дата доступу: 29.05.2014.

[18] Clergy of the Church of England Database. [Электронны рэсурс]. — London : King's College London, 2013. — Рэжым доступу: http://theclergydatabase.org.uk/ — Дата доступу: 29.05.2014.

[19] Szczepaniak J. Duchowieństwo diecezji krakowskiej w XVIII wieku. Studium prozopograficzne. — Kraków, 2011.

[20] Wereda D. Biskupi unickiej metropolii kijowskiej w XVIII wieku. — Siedlce; Lublin : Werset, 2013.

[21] Gerritsen A. Prosopography ... — P. 161–201.

[22] Sosna G., Troc-Sosna A. Hierarchia i kler kościoła prawosławnego w granicach II Rzeczypospolitej i Polski powojennej w XIX–XXI wieku. — Ryboły, 2012.

праваслаўнага духавенства (чорнага і белага) за перыяд 1839–2011 гг., а таксама больш за 130 біяграм мітрапалітаў і епіскапаў. У кнізе адсутнічае аналітычная частка, што ператварае працу ў звычайны каталог. Абсалютную большасць выкарыстаных крыніц складае перыёдыка (у тым ліку Валынскія, Гродзенскія і Літоўскія Епархіяльныя Ведамасці), часопісы, каталогі, царкоўныя календары. Архіўныя крыніцы выкарыстаны слаба, сярод апрацаваных архіваў пераважаюць архівы ўстаноў праваслаўнай царквы (архіў Мінскай епархіі, архіў Варшаўскай праваслаўнай мітраполіі, архівы асобных парафіяльных цэркваў і інш.). Зрэшты, і самі аўтары прызнаюць, што кніга планавалася ў першую чаргу як дапаможнік для вывучэння асабовага складу духавенства — аналагічныя мэты ставіла перад сабой Д. Нэйлс у сваёй вышэйзгаданай працы.

Першая спроба скласці спісы ўніяцкіх святароў і цэркваў з мэтай рэканструкцыі парафіяльнай сеткі і асабовага складу духавенства была здзейснена сакратаром Віцебскага губернскага статыстычнага камітэта А. Семянтоўскім у 1867 г. У «*Памятнай кніжцы Віцебскай губерні на 1867 год*» ён змясціў «*Спіс цэркваў, манастыроў і духавенства былой грэка-ўніяцкай Беларускай епархіі за 1839 год*»[23]. Звесткі былі прадстаўлены ў выглядзе табліцы з пазначэннем парадкавага нумара запісу, назвы губерні, павета, благачыння, царквы і манастыра, імені і прозвішча святара. Усяго ў спісе ўтрымлівалася 532 запісы па тэрыторыі Віцебскай, Магілёўскай, Мінскай, часткова — Валынскай, Кіеўскай і Херсонскай губерняў. Каштоўнасць гэтай крыніцы ў тым, што звесткі былі перададзены былым Полацкім уніяцкім архіепіскапам В. Лужынскім на падставе запісаў з асабістага архіва.

У адным з выданняў Віленскай археаграфічнай камісіі ў 1870 г. архіварыус Віленскага цэнтральнага архіва старажытных актаў М. Гарбачэўскі таксама апублікаваў падрыхтаваныя ім у сістэматызаваным выглядзе спісы святароў[24]. Тэрытарыяльныя межы ахоплівалі Брэсцкую частку Уладзімірска-Брэсцкай епархіі канца XVII ст. Для гэтай мэты складальнікам былі апрацаваны 2 актавыя кнігі Брэсцкага гродскага суда 1676–1677 і 1690 гг. Сабраныя звесткі былі пададзены ў выглядзе табліцы: назва царквы (на рускай мове ў алфавітным парадку), імя і прозвішча святара, год узгадкі і нумар старонкі ў актавай кнізе, адкуль узята інфармацыя.

У 1910 г. спісы ўніяцкіх святароў, якія падпісалі «*Вызнанне веры грэка-ўніяцкай царквы*» 1838 г. (праціўнікі далучэння да праваслаўя), а таксама спісы дэканаў Беларускай епархіі 1839 г. апублікаваў Г. Шавельскі[25]. У канцы XIX — пачатку XX ст. у Епархіяльных Ведамасцях у сістэматызаваным выглядзе часта друкаваліся біяграфічныя матэрыялы аб найбольш актыўных дзеячах па ўз’яднанні ўніяцкай і праваслаўнай цэркваў, у тым ліку аб шараговых парафіяльных святарах.

Спісы святароў Уладзімірскага афіцыялату Уладзімірска-Брэсцкай епархіі за 1715 г. з фондаў Архіва Санкт-Пецярбургскага інстытута гісторыі Расійскай акадэміі навук, а таксама Брэсцкага афіцыялату гэтай жа епархіі за 1729 г. з фондаў аддзела рукапісаў Нацыянальнай бібліятэкі ў Варшаве апублікавалі А. Гіль і І. Скачыляс[26].

Першую грунтоўную спробу вызначыць асабовы склад уніяцкага святарства здзейсніў польскі даследчык М. Радван — сам ён ахарактарызаваў гэтую спробу як *крыніцазнаўчую рэканструкцыю*. У сваёй кнізе «*Carat wobec kościoła greckokatolickiego w zaborze Rosyjskim 1796–1839*»[27] на падставе апрацоўкі дзясяткаў архіўных спраў ён апублікаваў спісы парафіяльных святароў усіх губерняў Расійскай імперыі 1837 г. (1696 асоб) і спісы бязмесцавых святароў 1802 г. (594 асобы). Да недахопаў прадстаўленых М. Радванам звестак можна аднесці практычную адсутнасць біяграфічных звестак аб святары (за

---

[23] Список церквей, монастырей и духовенства бывшей греко-унитской Белорусской епархии за 1839 год // Памятная книжка Витебской губернии за 1867 год. — Санкт-Петербург : В типографии К. Вульфа, 1867. — С. 122–139.

[24] АВАК. — Т. III. — Вильня : В типографии Губернскаго Правления, 1870. — С. 259–267.

[25] Шавельский Г. Последнее возсоединение с православною церковию униатов Белорусской епархии (1833–1839 гг.) — СПб. : Типография «Сельскаго Вестника», 1910. — Приложения. — С. 54–59.

[26] Ґіль А., Скочиляс І. Володимирсько-Берестейська єпархія XI–XVIII століть : історичні нариси. — Львів, 2013. — С. 208–219, 223–232.

[27] Radwan, M. Carat wobec kościoła greckokatolickiego w zaborze Rosyjskim 1796–1839 / M. Radwan. — Wydanie drugie. — Lublin : Instytut Europy Środkowo-Wschodniej, 2004.

выключэннем узросту і займаемай пасады). Да таго ж не ўсе імёны і прозвішчы адэкватна транслітараваныя з рускай мовы на польскую.

Расійскі даследчык А. В. Матысан распачаў выданне шматтомнага праекта па святарскай генеалогіі Цвярской праваслаўнай епархіі[28]. Кожны выпуск прысвечаны генеалогіі некалькіх святарскіх родаў. Паводле стану на 2007 г. А. В. Матысанам складзены радаводныя росписы 27 родаў, якія ўтрымліваюць артыкулы на 2850 чалавек. Да несумненных плюсаў працы варта аднесці тое, што ў ёй яскрава прасочваюцца роднасныя сувязі паміж прадстаўнікамі роду, падаецца ўся асноўная інфармацыя біяграфічнага характару аб канкрэтнай асобе (гады жыцця, навучанне, урадавыя ўзнагароды, месца працы, пасада, склад сям'і і інш.). Кнігі забяспечаны дасканала прадуманымі паказальнікамі, што робіць вельмі зручным карыстанне імі. Разам з тым, у зборніках ніяк не прадстаўлены аналіз сабранага і распрацаванага матэрыялу, што істотна зніжае іх навуковую вартасць. Зрэшты, магчымасці правядзення паўнавартаснага аналізу перашкаджае і штучна звужаны прадмет даследавання, які абмежаваны адміністрацыйнымі межамі адной епархіі.

У апошні час у беларускай гістарыяграфіі з'явіліся кнігі, прысвечаныя гісторыі канкрэтных святарскіх родаў[29], якія аднак часта ўяўляюць сабой нагрувашчванне фактаў без усялякага аналізу. Пакаленныя росписы некалькіх дзясяткаў духоўных родаў шляхецкага паходжання з тэрыторыі былой Мінскай губ. прадстаўлены ў «*Гербоўніку беларускай шляхты*»[30], рыхтуемых у Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі. Афармленне біяграфічных артыкулаў, выкарыстоўваемае пры падрыхтоўцы «*Гербоўніка…*», найбольш пасуе для сістэматызацыі звестак, якія былі атрыманы ў ходзе працы над дадзенай кнігай. У першую чаргу — гэта прысваенне парадкавага нумара асобе ў агульным спісе, паказ роднасных сувязей асобы з іншымі праз выкарыстанне сістэмы перакрыжаваных спасылак, пазначэнне арыгінальнага напісання прозвішча і імя (як у дакуменце). Метадалагічныя напрацоўкі па афармленні біяграфічных артыкулаў аб духоўных асобах, апублікаваных у «*Гербоўніку…*», былі актыўна выкарыстаны ў дадзенай рабоце.

Выкарыстанне метадалогіі прасапаграфіі найбольш зручнае для вывучэння асабовага складу эліт грамадства беларуска-літоўска-латышскіх зямель, якімі без сумневу з'яўляюцца прадстаўнікі духавенства абранага перыяду. На першым этапе была праведзена праца па збіранні тых звестак аб святарах, якія маюць непасрэднае дачыненне да іх жыццядзейнасці і кар'еры (гл. падраздзел «Сістэматызацыя і аналіз крыніц»). На другім этапе з выкарыстаннем метадалогіі прасапаграфіі праводзілася вывучэнне сабраных звестак, што дало магчымасць выявіць найбольш шматлікія святарскія дынастыі, вызначыць этапы іх фарміравання, правесці лакалізацыю месцаў пражывання і службы святароў, вылічыць сярэдні паказчык велічыні святарскіх сем'яў, здзейсніць пэўныя анамастычныя падлікі і інш.

Правядзенне даследавання ў два этапы паўплывала і на фарміраванне структуры дадзенай кнігі. Як можна ўбачыць, яна складаецца з дзвюх частак. Сабраныя і сістэматызаваныя прасапаграфічныя звесткі пададзены ў другой частцы. Ужо самі па сабе яны могуць служыць падставай для правядзення асобных генеалагічных даследаванняў, вывучэння фарміравання парафіяльнай сеткі, гісторыі царкоўнага і свецкага землеўладання. Першая ж, тэарэтычная, частка працы выконвае падвойную задачу. Яна падсумоўвае вынікі праведзенага даследавання, дае адказ на тыя пытанні, якія можна вырашыць з дапамогай метадалогіі прасапаграфіі, вызначае накірункі далейшага вывучэння праблемы. Разам з тым яна ўтрымлівае асноўную інфармацыю, неабходную для разумення другой часткі: тлумачэнне асаблівасцей сямейнага жыцця і кар'ернага росту святароў, суадносін паміж свецкай і духоўнай уладай, змяненне епархіяльных меж і структуры царкоўнай іерархіі і інш.

---

[28] Матисон А. В. Духовенство Тверской епархии XVIII — начала XX веков: родословные росписи. Вып. 1–5. СПб., 2003–2007. Выказваю шчырую падзяку расійскаму генеалогу і выдаўцу А. А. Шумкову (г. Санкт-Пецярбург) за магчымасць азнаёміцца з працамі расійскіх гісторыкаў, якія займаюцца вывучэннем святарскай генеалогіі.

[29] Плышевские — православные священно- и церковнослужители Беларуси XVIII–XX вв. — Минск : Белорусская Православная Церковь, 2008.

[30] Гербоўнік беларускай шляхты. Т. 1 / Т. Капіца, А. Леўчык, С. Рыбчонак і інш. — Мінск : БелНДІДАС, 2002; Гербоўнік беларускай шляхты. Т. 2. Б / С. Рыбчонак [і інш.]. — Мінск : НАРБ, 2007; Гербоўнік беларускай шляхты. Т. 3. В / Д. Ч. Матвейчык [і інш.]; навук. рэд. А. Рахуба. — Мінск : Беларусь, 2014.

**Агляд крыніц.** Пры вывучэнні асабовага складу ўніяцкага святарства адразу ж паўстае праблема адбору крыніц. Перыяд, разглядаемы ў гэтай працы, надта працяглы. Расійскай даследчыцай Ю. Ю. Юмашавай пры аналізе прасапаграфічных даследаванняў былі вылучаны чатыры методыкі працы з крыніцамі. Яны ўкладаліся ў наступныя ўмоўныя схемы: «*некалькі крыніц — адна персаналія*», «*некалькі крыніц — некалькі персаналій*», «*адна крыніца — адна персаналія*», «*адна крыніца — некалькі персаналій*»[31]. Найбольш распаўсюджаным метадам з'яўляецца прынцып «*адна крыніца — адна персаналія*». Ён характарызуецца выкарыстаннем крыніц анкетнага тыпу (анкета, асабовая картка, асабістая справа) і адсутнасцю верыфікацыі выяўленых дадзеных з дапамогай іншых крыніц. Самым працаёмкім з'яўляецца прынцып «*некалькі крыніц — адна персаналія*». Інфармацыя, сабраная аб адной асобе з некалькіх крыніц, патрабуе дакладнай верыфікацыі. За аснову ў зборы звестак для дадзенага даследавання быў узяты якраз гэты самы працаёмкі прынцып. Разам з тым біяграмы асобных святароў складзены на падставе кароткай узгадкі ў дакуменце і падпадаюць пад дзеянне першага прынцыпу працы з крыніцай. Ніжэй падрабязней будзе разгледжана ўстанаўленне каштоўнасці крыніц паводле іх аўтарытэтнасці.

Інфармацыя аб уніяцкіх святарах адклалася ў многіх відах дакументаў. Таму было вырашана ўзяць за аснову масавыя крыніцы: візіты, рэвізскія сказкі, справы аб рукапалажэнні. *Візіты* — пратаколы візітацый[32] уніяцкіх цэркваў. Найбольш поўна характарыстыка гэтага цікавага віду дакументаў пададзена ў працах сучасных украінскіх і польскіх даследчыкаў І. Скачыляса і А. Гіля[33]. Захаванасць візітаў па рэгіёнах выглядае нераўнамернай. Калі па тэрыторыі былой Кіеўска-Віленскай епархіі візіты захаваліся досыць добра амаль за ўвесь перыяд (а канкрэтна за 1680–1830-я гг.), то па былой Уладзімірска-Брэсцкай пераважна за XVIII ст. (у асноўным 1720–1770-я гг., па асобных тэрыторыях — 1802, 1804 гг.), па былой Пінска-Тураўскай фрагментарна за 1758–1798 гг. (у асноўным «Тураўская» частка епархіі за 1777–1786 гг.), а таксама невялікая колькасць за 1799–1803, 1820 гг. Візіты Полацкай архіепархіі захаваліся горш. Самыя раннія з вядомых — гэта візіты Барысаўскай пратапопіі за 1682 г., у наяўнасці маюцца таксама візіты ўсёй епархіі за 1703 г., аднак у гэты час вялікая частка цэркваў і парафій заставалася яшчэ праваслаўнай і таму, зразумела, візітацыі ўніяцкімі іерархамі не падлегла, візіты Мсціслаўскага афіцыялату (т. зв. «Мсціслаўскай» епархіі) 1737 г., візіты Барысаўскай і часткі Лепельскай пратапопій 1754 г., візіты т. зв. «Польска-Полацкай» епархіі (часткі, якая пасля першага падзелу 1772 г. засталася на тэрыторыі Рэчы Паспалітай) за 1789–1791 гг. і, нарэшце, візіты ўсёй Полацкай епархіі (абмежаванай Віцебскай і Магілёўскай губернямі) за 1822–1823 гг. Не буду спыняцца на падрабязнай характарыстыцы гэтага віду дакументаў, разгледжу толькі асаблівасці падачы звестак аб святарах і царкоўных служках.

У самых ранніх вядомых візітах занатавана імя і прозвішча святара, які знаходзіўся пры царкве. Ніякіх іншых дадатковых звестак — узрост, адукацыя, час высвячэння, склад сям'і і г. д. — не прыводзілася. Асобныя візіты (напрыклад, Мсціслаўскага афіцыялату 1737 г., «Польска-Полацкай» епархіі 1789–1791 гг.) увогуле абыходзілі асобу святара сваёй увагай. У візітах цэркваў Бабруйскага, Глускага і Рагачоўскага дэканатаў 1764 г. асобе святара адводзіўся пэўны аб'ём тэксту, толькі калі ён парушаў прынятыя нормы паводзін. Калі ж парох паводзіў сябе здавальняюча, яго характарыстыкі абмяжоўваліся ў лепшым выпадку ўзгадкай імя і прозвішча, а часта нават гэтыя мінімальныя звесткі апускаліся. Увогуле ж «сярэднестатыстычны» раздзел аб святары ў большасці візітаў утрымліваў: імя і прозвішча, дату атрымання прэзенты і прозвішча таго, хто яе выдаў, дату высвячэння і інсталяцыі і прозвішча епіскапа,

---

[31] Юмашева Ю. Ю. Историография просопографии // Круг идей: алгоритмы и технологии исторической информатики. — Москва, 2005. — С. 95–127.

[32] Візітацыя (ад лацінскага visitatio — наведванне, агляд) — арганізаваная епіскапам альбо дэканам планавая праверка падначаленых цэркваў. Адрозніваюць два віды візітацый: генеральная (епіскапская) і дэканская.

[33] Скочиляс І. Генеральні візитації Київської унійної митрополії XVII–XVIII століть. Львівсько-Галицько-Кам'янецька єпархія. Т. 2: Протоколи генеральних візитацій. Львів: Видавництво Українського Католицького Університету, 2004; Генеральні візитації церков і монастирів Володимирської унійної епархії кінця XVII — початку XVIII століть: книга протоколів та окремі описи / Wizytacje generalne cerkwi i monasterow unickiej eparchii wlodzimierskiej konca XVII — poczatku XVIII wieku: ksiega protokolow oraz inne opisy. / Загальна редакція та історичний нарис А. Ґіль, І. Скочиляс / Redakcja i wstep A. Gil, I. Skoczylas. — Львів; Люблін, 2012.

які іх здзейсніў, кароткія асабістыя характарыстыкі, якія сведчылі аб адпавядальнасці святара займаемай пасадзе. Звесткі аб царкоўных служках утрымліваліся, як правіла, толькі ў візітах XIX ст. Асобныя візіты мелі свае адметнасці. Так, у візітах цэркваў Навагрудскага дэканата 1754 г. падаваліся імёны і прозвішчы не толькі дзейсных парохаў, але і іх папярэднікаў. У дэканскіх візітах цэркваў Бельскага дэканата 1784 г. мелася характарыстыка асабістых якасцей святара: вучоны, пабожны, пільны, а таксама характарыстыка вопытнасці — нядаўна высвечаны, паважных гадоў і інш. У візітах цэркваў Літоўска-Віленскай епархіі 1819 г. падаваліся звесткі аб адукацыі святара, яго ўзросце, а таксама прыводзіліся імёны ўсіх членаў святарскай сям'і.

Недахоп візітаў па асобных рэгіёнах быў кампенсаваны некаторымі іншымі відамі крыніц. У першую чаргу — гэта *рэвізскія сказкі* святароў і царкоўнаслужыцеляў. Згадкі аб уніяцкім духавенстве беларуска-літоўска-латышскіх зямель утрымліваюць сказкі 1782, 1795, 1811, 1816 і 1834 гг. Найбольш такіх дакументаў захавалася па тэрыторыі Мінскай губерні — практычна за ўсе адзначаныя гады (апрача 1782 г., калі землі Міншчыны знаходзіліся ў складзе Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай). На захаванні ў НГАБ таксама маюцца сабраныя ў дзве аб'ёмныя адзінкі рэвізскія сказкі ўніяцкіх святароў Віцебскай губерні за 1811 і 1834 гг. Разам з візітамі 1703, 1789–1791, 1822–1823 гг. яны даюць магчымасць даволі поўна адсачыць асабовы склад духавенства ў гэтым рэгіёне за працяглы перыяд. Асаблівасцю рэвізскіх сказак уніяцкіх святароў 1834 г. з'яўлялася тое, што фармуляр уключаў у сябе звесткі і з папярэдняй, 7-й, рэвізіі 1816 г. Сказкі 1834 г. складаліся кіраўніцтвам Беларускай і Літоўскай духоўных кансісторый. Удалося адшукаць «здвоеныя» рэвізскія сказкі 1816–1834 гг. па тэрыторыі ўсёй Віцебскай губерні[34], Зельбургскага павета Курляндскай губерні[35], частцы Мінскай губерні, якая ўваходзіла ў склад Беларускай епархіі (Бабруйскі, Барысаўскі, Дзісенскі, Ігуменскі, Мазырскі і Рэчыцкі паветы)[36], а таксама ў склад епархіі Літоўскай (Вілейскі павет)[37]. Частку гэтага каштоўнейшага віду крыніц па тэрыторыі Гродзенскай і Магілёўскай губерняў, а таксама па паветах Мінскай губерні (Мінскі, Пінскі і Слуцкі), якія адносіліся да Літоўскай епархіі, адшукаць не ўдалося. Рэвізскія сказкі святароў і царкоўнаслужыцеляў Чачэрскага праваслаўнага духоўнага заказу 1811 і 1815 гг., якія ўтрымліваюць звесткі аб сем'ях «новадалучаных з уніі» святароў, толькі нязначна кампенсуюць гэты прабел. Сказкі 1834 г. утрымліваюць звесткі не толькі аб узросце членаў сям'і, але і аб месцы навучання (працы) тых асоб, якія стала не пражывалі на месцы прыпіскі: вучыліся ў семінарыі, духоўнай (свецкай) вучэльні, праходзілі вайсковую (цывільную) службу і г. д.

У рэвізскіх сказках 1795, 1816 і 1834 гг. падаваліся звесткі аб усіх членах сям'і святара альбо царкоўнага служкі з пазначэннем узросту[38]. Істотным недахопам з'яўляецца тое, што памылкі ў адзначаным узросце могуць складаць некалькі гадоў і нават дзесяцігоддзяў.

На захаванні ў LVIA маюцца дзве адзінкі, якія ўтрымліваюць копіі метрычных запісаў аб нараджэнні, шлюбе і навучанні святароў, час высвячэння якіх прыпаў на 1783–1784 гг., перыяд, калі намеснікам мітрапаліта на тэрыторыі Рэчы Паспалітай быў пінска-тураўскі епіскап Г. Дашковіч-Гарбацкі. Пераважная большасць гэтых святароў паходзіла, натуральна, з тэрыторыі Пінска-Тураўскай епархіі. Пры складанні спіса святароў былі таксама выкарыстаны *актавыя кнігі* Полацкай духоўнай *кансісторыі* 1774–1795 гг. (пасля ўтварэння ў 1780 г. асобнай кансісторыі для часткі Полацкай архіепархіі ў складзе Расійскай імперыі «старая» кансісторыя пачала называцца «Польска-Полацкай»). Гэтыя чатыры аб'ёмныя адзінкі захавання з фондаў НГАБ[39] утрымліваюць надзвычай важную інфармацыю аб святарах Полацкага, Віцебскага і Мсціслаўскага ваяв. Рэчы Паспалітай, а таксама Магілёўскага і Полацкага

[34] НГАБ. — Ф. 2640. — Воп. 1. — Спр. 65.

[35] LVVA. — F. 630. — Ap. 2. — L. 280.

[36] НГАБ. — Ф. 333. — Воп. 9. — Спр. 270.

[37] LVIA. — F. 515. — Ap. 15. — Bb. 691, 730.

[38] У рэвізскіх сказках 1811 г. пададзены звесткі толькі аб прадстаўніках мужчынскага полу.

[39] Лёс архіва былой Полацкай уніяцкай духоўнай кансісторыі да сённяшняга дня малавывучаны. Лічыцца, што ў пажары 1812 г. яе архіў цалкам загінуў. Між тым генеральныя візіты цэркваў т. зв. «Польска-Полацкай» епархіі 1789–1791 гг. трапілі ў фонд Холмскай грэка-ўніяцкай духоўнай кансісторыі ў Люблін (APL. — Z. 95. — Sygn. 143), візіты цэркваў усёй

намесніцтваў Расійскай імперыі. Апрацоўка названых крыніц дазволіла ў пэўнай ступені ліквідаваць прабел у вывучэнні асабовага складу духавенства па адзначаным рэгіёне.

Актавыя кнігі кансісторыі ўтрымліваюць запісы аб прызначэнні і адхіленні святароў ад пасад, аб высвячэнні прэтэндэнтаў у сан, аб фундушах асобных цэркваў і г. д. Аналагічныя крыніцы другой паловы XVIII ст. маюцца па тэрыторыі Уладзімірска-Брэсцкай епархіі і па асобных сурагацыях Кіеўска-Віленскай епархіі. Аднак з-за наяўнасці вялікай колькасці асноўных прамых крыніц па гэтых тэрыторыях было прынята рашэнне абмежавацца толькі частковым выкарыстаннем інфармацыі з гэтых дакументаў.

Важнымі крыніцамі, якія адлюстроўваюць адносіны святароў са свецкай уладай, з'яўляюцца *прэзенты*. Гэтыя дакументы дайшлі да нашага часу пераважна ў выглядзе копій — актыкацый у кнігах духоўных кансісторый, судовых устаноў і органаў гарадскога самакіравання. Разам з тым пэўная колькасць арыгіналаў прэзентаў захавалася ў фондах дваранскіх дэпутацкіх сходаў перыяду Расійскай імперыі[40].

Яшчэ адзін від крыніц па асабовым складзе ўніяцкага духавенства, які быў апрацаваны цалкам, — гэта т. зв. *справы аб рукапалажэнні*. Як правіла, кожная справа прысвечана асобе аднаго святара. Яна ўтрымлівае ўсе неабходныя біяграфічныя звесткі аб ім: копію запісу аб нараджэнні і хрышчэнні, копію запісу аб шлюбе, даведкі ад розных устаноў і прыватных асоб аб месцах навучання і працы прэтэндэнта перад высвячэннем у сан, пратаколы апытання сведак аб асабістых якасцях будучага святара. Усяго захавалася каля 330 такіх спраў за перыяд з 80-х гг. XVIII ст. да 30-х гг. XIX ст.

Вельмі шмат важнай і карыснай інфармацыі ўтрымліваюць *актавыя кнігі судовых устаноў* Вялікага Княства Літоўскага XVI–XVIII стст. Аднак апрацоўка ўсіх актавых кніг на прадмет пошуку інфармацыі аб уніяцкіх святарах заняла б некалькі дзесяцігоддзяў, прынамсі, сіламі аднаго толькі аўтара гэтых радкоў (толькі ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі захоўваецца каля 6000 актавых кніг за згаданы перыяд). Цвяроза ацэньваючы сітуацыю, спробы сістэматызавана прапрацоўваць актавыя кнігі не рабілі. Але гэты важны від крыніц усё ж не быў пакінуты ў баку. У дадзенай працы выкарыстаны матэрыял з актавых кніг Рэчыцкіх гродскага і земскага судоў, якія былі апрацаваны ў ходзе работы над планавай навуковай тэмай «*Гісторыя дзяржаўных устаноў Вялікага Княства Літоўскага*»[41].

У ходзе працы над кнігай удалося таксама папрацаваць з архівамі некаторых прыходскіх цэркваў, якія ўтрымліваюць дакументы XVIII–XIX стст. Так, у першай палове 2013 г. быў апрацаваны архіў Ракаўскай Праабражэнскай царквы Валожынскага раёна Мінскай вобласці, які ўтрымлівае дакументы пачынаючы з 1740 г.[42] Удалося таксама пазнаёміцца з часткай спраў т. зв. фонду «*Дакументы архіва*

Полацкай епархіі 1703 г. (25 пратапопій) і «Мсціслаўскай» епархіі 1732 г. трапілі ў фонд Канцылярыі мітрапаліта грэка-ўніяцкіх цэркваў у Расіі (РГИА. — Ф. 823. — Оп. 3. — Д. 455, 519), актавыя кнігі т. зв. «Польска-Полацкай» духоўнай кансісторыі 1774–1795 гг. трапілі ў фонд Мінскай праваслаўнай і Полацкай грэка-ўніяцкай духоўных кансісторый (НГАБ. — Ф. 136. — Воп. 1. — Спр. 41272, 41273, 41281; Ф. 3367. — Воп. 1. — Спр. 3). Гэта дае падставы меркаваць, што ў Полацку захоўваўся не ўвесь кансісторскі архіў, пэўная яго частка (зыходзячы са зместу захаваных дакументаў — адна з самых важных) захоўвалася ў іншым месцы, верагодна, у кляштары базыльянаў Св. Барыса і Глеба ў в. Бельчыцы пад Полацкам (вядомым таксама пад назвай Полацкага Барысаглебскага кляштара), а напрыканцы 90-х гг. XVIII ст. была перавезена альбо ў в. Вялікія Дольцы Барысаўскага пав., якая належала полацкім архіепіскапам і дзе ў якасці парафіяльнага святара служыў пісар надворнага суда Полацкай епархіі Сымон Глушневіч, альбо ў м. Галомысла Дзісенскага пав., дзе ў 1798 г. знаходзіўся цэнтр і размяшчалася канцылярыя наваствoранай Дзісенскай сурагацыйнай духоўнай кансісторыі.

[40] Падрабязней гл. Прадмову да выдання: Гербоўнік беларускай шляхты. Т. 3. В / Д.Ч. Матвейчык [і інш.]; навук. рэд. А. Рахуба. — Мінск : Беларусь, 2014.

[41] Велізарную дапамогу ў зборы матэрыялаў здзейсніў вядучы палеограф аддзела старажытных актаў НГАБ Герман Брэгер, які паралельна з работай над планавымі навуковымі тэмамі дапамагаў выяўляць матэрыял па асабовым складзе духавенства з актавых кніг Ашмянскіх і Гродзенскіх земскіх і гродскіх судоў, часткова Аршанскага, Ваўкавыскага, Віцебскага, Мазырскага, Мінскага, Навагрудскага і Слонімскага гродскіх судоў.

[42] Выказваю шчырую падзяку настаяцелю Ракаўскай Праабражэнскай царквы айцу Сергію Лепіну за магчымасць азнаёміцца з гэтымі каштоўнымі дакументамі, а таксама былой загадчыцы аддзела аўтаматызаваных архіўных тэхналогій НГАБ Ганне Мажэйка і загадчыцы аддзела інфармацыйна-пошукавых сістэм НГАБ Галіне Акуловіч за дапамогу ў апісанні спраў архіва і складання іх вопісу. Падрабязней аб гэтым гл. наш артыкул: Лісейчыкаў Д. В. Архівісты ўпершыню вызначылі сапраўднасць і апісалі дакументы архіва праваслаўнага храма // Архівы і справаводства. — № 1. 2014. — С. 97–103.

*Лідскага благачынння*», які захоўваецца ў архіве Мінскай духоўнай акадэміі і семінарыі (в. Жыровічы Слонімскага раёна Гродзенскай вобласці)[43].

У якасці дадатковых крыніц часткова выкарыстоўваліся звесткі з *метрычных кніг* уніяцкіх цэркваў, *спраў аб дваранскім паходжанні родаў* з фондаў Мінскага губернскага дваранскага дэпутацкага сходу, разнастайныя *спісы святароў*, якія складаліся з розных нагод, *фундушы* цэркваў і інш.

Былі выкарыстаныя і некаторыя спецыфічныя віды крыніц. Да іх ліку можна аднесці *ўласніцкія інскрыпцыі* на палях кніг, якія дазволілі істотна дапоўніць біяграмы асобных святароў, а таксама *надмагільныя помнікі* (як правіла, XIX ст.), пошук і фіксацыя якіх праводзіліся мною ў 2008–2014 гг. Выяўленне такіх крыніц праводзілася спарадычна і не насіла сістэматычнага характару. Між тым, фрагментарныя звесткі, атрыманыя такім шляхам, з'яўляюцца каштоўнымі і вартымі ўключэння ў кнігу.

Інфармацыя аб адной і той жа асобе часта ўтрымлівалася ў розных крыніцах. Калі-нікалі ў іх траплялісе супярэчнасці: памылкова пазначана дата прэзентацыі альбо высвячэння, дапушчана памылка ў напісанні імя святара, па-рознаму адзначаны яго ўзрост і г. д. У такіх выпадках перавагу аддавалася звесткам з больш аўтарытэтнай крыніцы. Калі супярэчнасці ўтрымлівалі матэрыялы генеральнай (епіскапскай) і дэканскай візіты, то за аснову браліся звесткі з генеральнай. Калі ж супярэчнасці ўтрымлівалі генеральныя візіты за розныя гады, то ў такім выпадку аддавалася перавага звесткам з таго дакумента, дата складання якога была бліжэйшай у часе да падзеі. Напрыклад, калі візіта 1774 г. сцвярджае, што святар быў прэзентаваны 29.05.1770, а візіта 1784 г. падае дату 09.05.1770, то прыярытэт пры складанні артыкула надаваўся першай крыніцы.

У выніку правядзення даследавання была праведзена прыблізная **класіфікацыя крыніц паводле аўтарытэтнасці** (у парадку яе змяншэння):

1. Арыгіналы прэзентаў, стаўленых грамат, фундушоў, інвентароў і інш.
2. Актыкацыі аналагічных дакументаў у судовых установах і органах гарадскога самакіравання.
3. Узгадкі аб святарах у актавых кнігах судовых устаноў і органах гарадскога самакіравання.
4. Метрычныя кнігі цэркваў і касцёлаў.
5. Генеральныя візіты.
6. Дэканскія візіты.
7. Справы аб рукапалажэнні.
8. Рэвізскія сказкі.
9. Спісы святароў.

Асобна ад гэтага знаходзяцца тыя звесткі, якія былі ўзяты з археаграфічных выданняў і навуковых прац (у першую чаргу тых, што ўтрымліваюць публікацыю першакрыніц).

## Сістэматызацыя і аналіз крыніц

Праца па зборы звестак аб уніяцкіх святарах была распачата ў 2002 г. Асноўная ўвага была скіравана на вывучэнне асабовага складу духавенства, крыніц фарміравання пласта ўніяцкага святарства як такога. Асобныя аспекты праблемы вывучэння святарскай генеалогіі разгледжаны ў некаторых маіх работах[44].

---

[43] Выказваю шчырую падзяку святару царквы Св. Георгія ў г. Лідзе Гродзенскай вобл. айцу Уладзіміру Камінскаму і краязнаўцу Леаніду Лаўрэшу за дапамогу ў знаёмстве з гэтымі дакументамі. Падрабязней гл. артыкул: Кунцэвіч А. З глыбіні стагоддзяў: архіў Лідскага дабрачынння // Павет. Старонка № 1 Ліды і Лідскага павета [Электронны рэсурс]. — Ліда, 2014. — Рэжым доступу: http://pawet.net/library/history/city_district/religion/archiv/Архіў_Лідскага_дабрачыння.html — Дата доступу: 12.02.2014.

[44] Лісейчыкаў Д. В. Бенефіцыяльныя сваяцкія кланы ўніяцкай царквы на Беларусі ў XVIII — першай трэці XIX ст. // Історія релігій в Україні. Науковий щорічник. — Львів : Логос, 2006. — С. 365–373; Lisiejczykaŭ Dzianis. Фарміраванне сваяцкіх саюзаў сярод уніяцкага святарства беларуска-літоўскіх земляў у XVI–XIX стст. // Studia i materiały do dziejów chrześcijaństwa wschodniego w Rzeczypospolitej. — T. 5. — Studia z dziejów i tradycji metropolii kijowskiej XII–XIX wieku. — Red. A. Gil. — Lublin, 2009. — S. 121–136; Лісейчыкаў Д. В. Хруцкія: уніяцкі святарскі род Полацкай епархіі // Асоба і час. Выпуск 5. — Мінск : Лімарыус, 2013. — С. 313–327.

Сабраныя звесткі аб асобе святара альбо царкоўнага служкі афармлены ў выглядзе біяграфічных артыкулаў — *біяграм* (гл. частку II). Для спрашчэння пошуку неабходнай біяграмы, а таксама для магчымасці стварэння спасылкі на яе кожнай з іх прысвоены парадкавы нумар. Каб не заблытацца ў сістэме гіперспасылак, якая складзена і да спіса выкарыстаных крыніц, і да святарскіх біяграм, у нумарацыю апошніх дададзена літара «а». Напрыклад, спасылка **314** азначае, што неабходна глядзець адпаведную пазіцыю ў спісе выкарыстаных крыніц, спасылка ж **314-а** азначае, што неабходна глядзець біяграму з адпаведным парадкавым нумарам.

Прозвішчы і імёны святароў пададзены ў алфавітным парадку ў транслітарацыі на сучасную беларускую мову, адначасова *курсівам* падаецца іх арыгінальнае напісанне (правапіс і мова арыгінальнага дакумента — старабеларуская, руская, польская, лацінская — захаваны).

Пры транслітарацыі на сучасную беларускую мову прозвішчы падаюцца як мага бліжэй да арыгінала. Так, напрыклад, захаваны ўсе варыянты напісання аднаго і таго ж прозвішча: **Войля**, **Войлеў**, **Вайлевіч**. Гэта дазваляе прасачыць трансфармацыі і ўскладненне формы прозвішча. Калі ж у арыгінальным напісанні былі дапушчаны відавочныя памылкі, утвораныя ў выніку занатоўкі прозвішча пісарам «на слых» (**Біліновіч** замест **Беліновіч**, **Клімянтовіч** замест **Клімантовіч**, **Пнікевіч** замест **Пінкевіч** і інш.), яны прыводзяцца ў адпаведнасць з усталяванай (альбо найчасцей сустракаемай) формай напісання прозвішча. Немэтазгоднасць захавання ўсіх формаў памылковага напісання пры транслітарацыі прывяла б да ўскладнення ідэнтыфікацыі носьбітаў аднаго і таго ж прозвішча. Разам з тым, усе формы захаваны ў арыгінальным напісанні, якое падаецца *курсівам*. Дзеля таго каб пазбегнуць «закрыцця» памылковай інфармацыі, у кнізе выкарыстоўваецца сістэма адсылак ад адной формы напісання да другой. Напрыклад: **Біліновіч**. Гл. **Беліновіч**, альбо **Войля**. Гл. таксама **Вайлевіч**, **Войлеў, Вайневіч**. У выпадку, калі маюцца дакладныя звесткі аб бацьку асобы, гэтыя звесткі пададзены ў суправаджэнні гіперспасылкі, напрыклад **Андрэй сын Пятра (1648-а)**.

У біяграме змешчаны **асноўныя звесткі аб асобе**, якія ўдалося сабраць: дата і месца нараджэння (хрышчэння) і смерці (пахавання), дата атрымання прэзенты і высвячэння ў сан, імя і прозвішча калятара, які выдаў прэзенту, і епіскапа, які здзейсніў высвячэнне і прызначэнне на пасаду, месца і час навучання, месца і час духоўнага служэння, склад сям'і. У выпадку наяўнасці цікавых нестандартных характарыстык асобы, якія маюць дачыненне да яго роду заняткаў альбо паходжання, яны пададзены даслоўна ў перакладзе на беларускую мову (у гэтым выпадку цытата бралася ў двукоссе).

Пры падачы звестак аб населеным пункце разам з яго назвай пазначалася толькі назва павета, на тэрыторыі якога ён знаходзіўся. Назвы ваяводстваў, губерняў і дзяржаў апускаліся. Выключэнне зроблена для Мсціслаўскага і Полацкага ваяводстваў (якія на паветы не дзяліліся), а таксама для тых населеных пунктаў, якія знаходзіліся па-за межамі Вялікага Княства Літоўскага (да 1795 г., а па ўсходзе Беларусі — да 1772 г.) і Расійскай імперыі (пасля 1795 г., а па ўсходзе Беларусі — пасля 1772 г.). У выпадку з апошнімі назвы губерняў падаваліся толькі тады, калі населеныя пункты знаходзіліся па-за межамі «асноўных» губерняў (Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай, Магілёўскай, Мінскай, Курляндскай, а таксама Беластоцкай вобласці), што разглядаюцца ў працы.

Сабраная інфармацыя ахоплівае працяглы перыяд часу — звыш 200 гадоў. У сувязі з гэтым уяўляецца немэтазгодным падаваць у кнізе тытулы цэркваў (Св. Мікалая, Св. Пятра і Паўла і г. д.), паколькі яны нярэдка мяняліся, што магло б стварыць уражанне, што тут прадстаўлена інфармацыя аб розных храмах. Тытулы цэркваў падаюцца толькі тады, калі дакладна вядома, што ў населеным пункце існавала некалькі храмаў з уласнай парафіяй. Наяўнасць прыпісных цэркваў і капліц улічвалася толькі тады, калі пры іх знаходзіўся адмысловы святар.

Даты ў тэксце падаюцца лічбамі: напрыклад, 12.09.1756–12 верасня 1756 г.; калі ж адсутнічае дакладны дзень, назва месяца ўсё адно падаецца ў лічбавым выглядзе, напрыклад, 08.1768 — жнівень 1768 г. Квадратныя дужкі [ альбо ] перад альбо пасля даты азначаюць, што чалавек займаў пасаду з пэўнага часу альбо да пэўнага часу. Адсутнасць квадратнай дужкі перад/пасля даты азначае, што чалавек мог займаць пасаду і раней/пазней адзначанай даты. Напрыклад, дата [1783–1804 азначае, што святар займаў сваю пасаду з 1783 г., паводле стану на 1804 г. таксама маюцца звесткі аб знаходжанні яго на гэтай

пасадзе, аднак час яго сыходу дакладна не ўстаноўлены. **Даты пададзены паводле юліянскага календара**, паколькі гэты каляндар выкарыстоўваўся ў афіцыйным справаводстве ўніяцкай царквы. У шэрагу выпадкаў, аднак, вымушаны прызнаць, што дакладна ўстанавіць сістэму летазлічэння, выкарыстаную ў крыніцы, немагчыма. Напрыклад, тэксты візітаў, складзеных паводле юліянскага календара, падаюць дакладныя даты прэзентаў, складзеных свецкімі калятарамі, сярод якіх пераважалі каталікі лацінскага абраду, што карысталіся грыгарыянскім календаром. Можна толькі дапускаць, што складальнікі візітаў пазначалі дату прэзентацыі святара з улікам каляндарнай розніцы.

Пасля кожнай біяграмы ў квадратных дужках падаюцца спасылкі на выкарыстаныя крыніцы: парадкавы нумар у спісе, далей праз коску нумары аркушаў, спасылкі на розныя крыніцы, аддзеленыя кропкай з коскай.

У кнізе пададзены прозвішчы і імёны не толькі парафіяльных святароў, але і вікарыяў (у дакументах называліся таксама каад'ютарамі альбо правізамі), дыяканаў і царкоўных служак — дзячкоў (псаломшчыкаў), панамароў і інш. Неабходнасць такога кроку тлумачыцца тым, што большасць пасад царкоўных служак займалі прадстаўнікі святарскіх родаў, але так бы мовіць «бедныя сваякі», для якіх не знайшлося святарскіх пасад. Разам з тым маецца даволі вялікая колькасць «выпадковых» людзей на гэтых ніжэйшых прыступках царкоўнай іерархіі — выхадцаў з дробнай шляхты, мяшчан альбо нават сялян.

Нярэдка епіскапскае прызначэнне (інсталяцыя) прэтэндэнта на пасаду святара адбывалася нашмат пазней за складанне калятарам прэзенты. Але ўвесь гэты час прэтэндэнт знаходзіўся, што называецца, «пры царкве», а падчас і выконваў святарскія абавязкі. Таму падаецца правільным пазначаць у якасці пачатку нясення святарскай службы менавіта дзень інсталяцыі. Толькі з гэтага дня прэтэндэнт кананічна рабіўся святаром пэўнай царквы.

Пры перадачы імёнаў уласных было вырашана прытрымлівацца наступнага прынцыпу. Імёны ўласныя святароў і царкоўнаслужыцеляў падаваліся максімальна набліжанымі да царкоўнаславянскай формы напісання. Так, польскамоўныя формы святарскіх імёнаў (напрыклад, *Józef*, *Daniel*, *Samuel*) у перакладзе на сучасную беларускую мову пададзены як *Іосіф*, *Данііл*, *Самуіл*. У той жа час аналагічныя імёны калятараў (практычна заўсёды рымска-каталіцкага веравызнання) пры перакладзе падаваліся як *Юзаф*, *Даніэль*, *Самуэль*.

Назвы населеных пунктаў падаюцца ў адпаведнасці з даведнікам Я. Н. Рапановіча[45]. Многія населеныя пункты на працягу даследуемага перыяду мянялі свой статус: вёскі рабіліся мястэчкамі, гарады занепадалі і таксама пераходзілі ў катэгорыю мястэчак. Дзеля таго каб упарадкаваць напісанне геаграфічных пунктаў, было прынята наступнае рашэнне. Азначэнне «горад» ужываецца да ўсіх павятовых цэнтраў Рэчы Паспалітай, Расійскай імперыі, Каралеўства Прусіі, Аўстрыі, а таксама да найбольш значных населеных пунктаў, якія не з'яўляліся павятовымі цэнтрамі: Бранск, Крычаў, Мядзел, Нясвіж і Цеханавец. Статус астатніх населеных пунктаў занатоўваўся паводле крыніцы: рускае (старабеларускае) *село*, *деревня*, польскае *sioło, wieś* перадаваліся як *вёска*, рускае (старабеларускае) *местечко*, польскае *miasteczko* (а ў некаторых выпадках і *miasto*) — як *мястэчка*.

Адміністрацыйна-тэрытарыяльная прыналежнасць населеных пунктаў перыяду Рэчы Паспалітай пададзена паводле Генеральнай карты «*Беларускія землі ў XVI ст.*» (аўтар М. Ф. Спірыдонаў)[46] і Генеральнай карты «*Беларускія землі ў канцы XVIII ст.*» (аўтары Я. К. Анішчанка і В. Л. Насевіч)[47].

Каб ацаніць паўнату сабраных у кнізе звестак, правядзём некаторыя падлікі. У першую чаргу неабходна высветліць колькасць парафій на разглядаемых у кнізе тэрыторыях. Калі за аснову браць епархіяльныя межы, то згодна з найбольш грунтоўнай на сённяшні час па гэтым пытанні працы польскага

---

[45] Рапановіч Я. Н. Слоўнік населеных пунктаў Віцебскай вобласці / рэд. П. П. Шуба. — Мінск : Навука і тэхніка, 1977; Тое ж Брэсцкай вобласці. — Мінск : 1980; Тое ж Мінскай вобласці. — Мінск : 1981; Тое ж Гродзенскай вобласці. — Мінск : 1982; Тое ж Магілёўскай вобласці. — Мінск : 1983; Тое ж Гомельскай вобласці. — Мінск : 1986.

[46] Вялікі гістарычны атлас Беларусі. У 3 т. — Т. 1. — Мінск : Белкартаграфія, 2009. — С. 96–150.

[47] Вялікі гістарычны атлас Беларусі. У 3 т. — Т. 2. — Мінск : Белкартаграфія, 2013. — С. 68–122.

даследчыка В. Колбука, паводле стану на 1772 г. на тэрыторыі «літоўскай» часткі Кіеўска-Віленскай епархіі, Полацкай архіепархіі, Брэсцкага афіцыялату Уладзімірска-Брэсцкай епархіі і Пінска-Тураўскай епархіі налічвалася 1712 уніяцкіх парафій[48]. Найноўшыя даследаванні арганізацыйнай структуры Пінска-Тураўскай епархіі польскага гісторыка В. Вальчака[49] паказваюць, што колькасць парафій на гэтай тэрыторыі ў В. Колбука была заніжанай і налічвае не 201, а 238 цэркваў. З улікам гэтай папраўкі вынікае, што на 1772 г. на разглядаемых тэрыторыях функцыянавала 1749 уніяцкіх парафій.

У астатні перыяд колькасць уніяцкіх цэркваў заўсёды была меншай. У 1837 г. у беларуска-літоўска-латышскіх губернях (Віленская, Віцебская, Гродзенская, Курляндская, Мінская і Магілёўская) яна раўнялася 1093[50]. Дакладныя лічбы за іншы перыяд падаць складана. Аднак у распараджэнні даследчыка маецца поўны пералік уніяцкіх цэркваў Мінскага і Навагрудскага паветаў Вялікага Княства Літоўскага паводле стану на 1680–1682 гг. На гэтых цэнтральнабеларускіх землях на той час налічвалася 154 царквы[51]. Паводле маіх падлікаў (падрабязны спіс гл. у геаграфічным паказальніку дадзенай працы[52]) на гэтых жа тэрыторыях на момант найбольшага пашырэння уніі (1770-я гг.) налічвалася 293 храмы. Такім чынам, у канцы XVII ст. цэркваў пад уніяцкай юрысдыкцыяй у згаданым рэгіёне было ў 1,9 разоў (293/154=1,9) менш, чым у другой палове XVIII ст. З пэўнай доляй верагоднасці дадзеную прапорцыю можна выкарыстаць і для астатніх разглядаемых у гэтым даследаванні зямель. Зразумела, што колькасць храмаў, што засталіся пад праваслаўнай юрысдыкцыяй, на ўсходзе і поўдні будзе большай, але на захадзе і поўначы — меншай, г. зн. будзе нівеляванца ў бок дакладнай лічбы. З улікам вылічанай прапорцыі можна дапусціць, што ў канцы XVII ст. на даследуемай тэрыторыі існавала прыблізна 921 царква (1749/1,9=920,5). І толькі зусім гіпатэтычна можна ўжыць такую ж прапорцыю, каб хаця б прыблізна даць ацэнку колькасці цэркваў пад уніяцкай юрысдыкцыяй на тых жа землях у пачатку XVII ст. Атрымліваецца каля 485 (921/1,9=484,7). Такое нават не зусім дакладнае дапушчэнне неабходна, каб атрымаць уяўленне аб колькасці ўніяцкіх парафій на працягу ўсяго разглядаемага перыяду.

Такім чынам, сярэдняя колькасць уніяцкіх цэркваў за ўвесь перыяд складае крыху болей за 1000, а менавіта (485+921+1749+1093)/4=1062. Змена святароў пры цэрквах у сярэднім адбывалася з перыядычнасцю 1 раз на 20 гадоў. Разглядаемы перыяд складае 243 гады. Атрымліваецца, каб дасканала вывучыць асабовы склад уніяцкага духавенства 1596–1839 гг., неабходна сабраць звесткі аб 12,9 тысячах асоб: (243/20)×1062=12903,3. Пры цэрквах, апрача асоб духоўнага стану, уласна святароў, знаходзіліся яшчэ і члены царкоўнага прычту — дзякі (дзячкі)[53]. У канцы XVIII — пачатку XIX ст. сярэдняя колькасць асоб духоўнага стану і прычту пры адной парафіі была каля 3 (частай з'явай зрабіліся вікарыі, наяўнасць некалькіх дзячкоў альбо панамароў). Аднак апрача рэвізскіх сказак і позніх візітаў 20–30-х гг. XIX ст. іх прысутнасць у масавых крыніцах практычна не адзначалася. Так што памнажаць лічбу асоб трэба як мінімум на 2. Такім чынам, дзеля таго каб ахапіць усё ўніяцкае духавенства і царкоўны прычт беларуска-літоўска-латышскіх зямель 1596–1839 гг., неабходна сабраць звесткі аб 25,8 тысячах персаналій (12903,3×2=25806,6). Назавём гэты паказчык *ідэальнай лічбай*.

---

[48] Kołbuk, W. Kościoły wschodnie w Rzeczypospolitej około 1772 roku / W. Kołbuk. — Lublin : Instytut Europy Środkowo Wschodniej, 1998. — S. 81–95, 152–169, 312–319, 324–328.

[49] Walczak W. Struktura terytorialna unickiej eparchii turowsko-pińskiej w XVII–XVIII wieku // Studia i materiały do dziejów chrześcijaństwa wschodniego w Rzeczypospolitej. — T. 5. Studia z dziejów i tradycji metropolii kijowskiej XII–XIX wieku. — Red. A. Gil. — Lublin, 2009. — S. 213–229; Walczak W. Unicka eparchia turowska-pińska w XVII–XVIII wieku. Struktura organizacyjna. — Białystok, 2012.

[50] Radwan, M. Carat wobec kościoła greckokatolickiego... — S. 193–194, 350–376, 385–408.

[51] Візіты ўніяцкіх цэркваў Мінскага і Навагрудскага сабораў 1680–1682 гг. : зборнік дакументаў / уклад. Д. В. Лісейчыкаў. — Мінск : І. П. Логвінаў, 2009. — С. 238–248, 256.

[52] Колькасць цэркваў падлічана з дапамогай аўтаматычнай пошукавай сістэмы (фільтр «п (парафіяльная царква)» — «Павет Рэчы Паспалітай»).

[53] Не блытаць з дыяканамі, якія таксама адносіліся да духоўнага стану. Падрабязней пра інстытут дыяканства ва ўніяцкай царкве гл. разгляд напрацовак канадскага гісторыка П. Ґаладзы ў падраздзеле «Кар'ера, адукацыя, сям'я» дадзенай кнігі.

Зразумела, што сабраць звесткі аб такой колькасці асоб немагчыма фізічна. Зусім не з-за таго, што гэты кавалак работы не пад сілу аднаму даследчыку. Справа ў тым, што першыя масавыя крыніцы па святарскай генеалогіі датуюцца канцом XVII ст. Візітамі ахоплены перыяд 1680–1830-х гг., метрычнымі кнігамі 1710–1830-х гг., рэвізскімі сказкамі 1790–1830-х гг. Сабраць больш-менш поўныя біяграфічныя звесткі аб духавенстве ўяўляецца рэальным толькі пачынаючы з канца XVII ст. (гл. малюнак 1). Звесткі аб святарах больш ранняга перыяду пры самай скрупулёзнай апрацоўцы ўсіх даступных дакументаў заўсёды будуць фрагментарнымі. Таму для падлікаў рэальнага аб'ёму даследчыцкай працы падыходзіць толькі перыяд 1680–1830-х гг.

Правядзём аналагічныя арыфметычныя дзеянні з улікам скарэктаваных зыходных дадзеных. Сярэдняя колькасць уніяцкіх парафій у гэты перыяд (921+1749+1093)/3=1254,3. Змена святароў прыблізна 1 раз на 20 гадоў. Перыяд разгляду — 159 гадоў. Каб вывучыць асабовы склад уніяцкага духавенства 1680–1839 гг., неабходна сабраць звесткі аб 9,5 тысячах асоб: (159/20)×1254,3=9971,7. Неабходна ўлічыць яшчэ наяўнасць вікарыяў і/альбо дзячкоў. Атрымліваем паказчык каля 19,9 тысяч (9971,7×2=19943,4). Назавём яго *рэальнай лічбай*.

У дадзенай працы сабраны звесткі аб 8480 святарах і царкоўнаслужыцелях, што складае 32,8% ад *ідэальнай лічбы* і 42,5% — ад *рэальнай*. Прадстаўленасць сабраных біяграфічных звестак аб святарах за розныя храналагічныя адрэзкі істотна адрозніваецца. Напрыклад, па першай трэці XIX ст. удалося скласці 3686 біяграм, па ўсім жа XVIII ст. — 4166, а па XVII ст. — толькі 614. Падрабязныя падлікі прадстаўлены на малюнку 1 (таксама гл. храналагічны паказальнік).




*Малюнак 1.* Колькасць біяграм па дэкадах

У межы даследавання патрапіў і шэраг парафій, не ўлічаных В. Колбукам праз аб'ектыўныя прычыны. Адны парафіі існавалі ў XVII — пачатку XVIII ст. і былі зачынены да 1772 г., у лік дзейных уніяцкіх парафій таксама былі аднесены парафіі пры скасаваных у першай трэці XIX ст. базыльянскіх кляштарах і нязначная колькасць новых парафій, заснаваных у перыяд пасля 1772 г. Такім чынам, за ўвесь разглядаемы перыяд на вышэйзгаданых тэрыторыях было налічана 1826 парафій. З іх на

тэрыторыі сённяшняй Беларусі знаходзілася 1490 парафій, Польшчы — 178, Расіі — 92, Украіны — 46, Латвіі — 13, Літвы — 7 (падрабязны спіс гл. у геаграфічным паказальніку дадзенай працы[54]).

Праца забяспечана **асабовым, геаграфічным і храналагічным паказальнікамі**.

У **асабовы паказальнік** вынесены прозвішчы і імёны асоб, якія сустракаюцца ў святарскіх біяграмах: калятары, епіскапы, сваякі і інш. Гэтыя звесткі могуць быць карыснымі для даследчыкаў, што працуюць над генеалогіяй свецкай шляхты, а таксама для навукоўцаў, якія займаюцца вывучэннем землеўладання і дзяржаўных пасад канца XVI — пачатку XIX ст.

У **геаграфічны паказальнік** вынесены ўсе геаграфічныя назвы, якія сустракаюцца ў біяграмах. Ён выкананы ў выглядзе табліцы, у 8 графах якой утрымліваецца шэраг дадатковай інфармацыі. Графа 1 падае назву населенага пункта на беларускай мове. У выпадку, калі населены пункт з'яўляўся цэнтрам парафіі, у графе 2 ставілася літара «п», калі ў населеным пункце адзначана наяўнасць філіяльнай царквы альбо капліцы — літара «ф». Графа 3 утрымлівае сучаснае напісанне населенага пункта (на мове той краіны, дзе ён цяпер знаходзіцца, — беларускай, польскай, рускай, украінскай, латышскай, літоўскай і г. д.). У графе 4 пазначана сучасная дзяржаўная прыналежнасць населенага пункта. Графы 5, 6 і 7 змяшчаюць інфармацыю аб прыналежнасці населеных пунктаў да дробных адміністрацыйных адзінак — паветаў Рэчы Паспалітай, Расійскай імперыі і раёнаў Рэспублікі Беларусь. Калі пункт у той ці іншы перыяд не адносіўся да тэрыторыі названых дзяржаў, адпаведныя графы не запаўняліся. Апошняя 8-я графа ўтрымлівае нумар старонкі кнігі, дзе фігуруе населены пункт.

**Храналагічны паказальнік** мае сваёй мэтай структураваць біяграмы паводле перыяду, які ў іх апісваецца. У якасці ўмоўнай адзінкі адліку была ўзята *дэкада* — дзесяцігоддзе. Выключэнне зроблена толькі для XVI ст., святарскіх біяграм па якім вельмі мала, да таго ж некаторыя ўтрымліваюць звесткі ранейшыя за 1596 г. У сувязі з гэтым усе біяграмы за XVI ст. пададзены ў паказальніку адным блокам. Прывязкай біяграмы да канкрэтнай дэкады служыць дата высвячэння святара ў сан альбо ўступлення царкоўнаслужыцеля на пасаду. Калі дакладныя звесткі аб гэтых падзеях адсутнічалі, за аснову бралася дата ўзгадкі асобы ў дакуменце. Пры наяўнасці некалькіх узгадак выбіралася самая ранняя. Паколькі сабраныя прасапаграфічныя звесткі будуць запатрабаваны даследчыкамі, якія вывучаюць гісторыю ўніяцкай царквы і духавенства розных перыядаў, увядзенне такога храналагічнага паказальніка падаецца вельмі неабходным.

Навукова-даведачны апарат кнігі пабудаваны такім чынам, каб ён мог паслужыць міжфондавым і міжархіўным паказальнікам па візітах і інвентарах уніяцкіх храмаў і іншых дакументах, якія адлюстроўваюць гісторыю асобных цэркваў і парафій. Таму дадзенае выданне будзе карысным для краязнаўцаў і ўсіх, хто вывучае гісторыю асобных цэркваў на беларуска-літоўска-латышскіх землях.

Пры напісанні кнігі былі выкарыстаны дакументы з фондаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі (НГАБ, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь), Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі ў г. Гродна (НГАБ, г. Гродна, Рэспубліка Беларусь), Дзяржаўнага архіва ў Любліне (APL, г. Люблін, Рэспубліка Польшча), Дзяржаўнага гістарычнага архіва Літвы (LVIA, г. Вільня, Літоўская Рэспубліка), Дзяржаўнага гістарычнага архіва Латвіі (LVVA, г. Рыга, Латвійская Рэспубліка), Расійскага дзяржаўнага гістарычнага архіва (РГИА, г. Санкт-Пецярбург, Расійская Федэрацыя), Цэнтральнага дзяржаўнага гістарычнага архіва Украіны ў г. Кіеве (ЦДІАК, г. Кіеў, Украіна), Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь (НГМРБ, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь), Аддзела рукапісаў Бібліятэкі Акадэміі навук Літвы імя Урублеўскіх (LMAB, г. Вільня, Літоўская Рэспубліка).

[54] Колькасць цэркваў падлічана з дапамогай аўтаматычнай пошукавай сістэмы (фільтр «п (парафіяльная царква)» — «Сучасная краіна»).

# Спіс выкарыстаных крыніц


1. Archiwum państwowe w Lublinie (далей APL). — Z. 95. — Sygn. 101. — Генеральныя візіты цэркваў Холмска-Бэлзскай епархіі. Б/д; генеральныя візіты цэркваў Люблінскага дэканата. 1720 г.; генеральныя візіты цэркваў Бельскага (цэнтр — м. Белая (сёння г. Бяла-Падляшская) Бельскага пав.), Бельскага (цэнтр — г. Бельск), Брэсцкага, Драгічынскага, Камянецкага, Кобрынскага, Мельніцкага, Палескага, Пружанскага і Уладаўскага дэканатаў. 1725–1727 гг.
2. APL. — Z. 95. — Sygn. 108. — Генеральныя візіты цэркваў Люблінскага і Ратненскага дэканатаў. 1748–1749 гг.
3. APL. — Z. 95. — Sygn. 109. — Генеральныя візіты цэркваў Драгічынскага дэканата. 1757 г.
4. APL. — Z. 95. — Sygn. 116. — Генеральныя візіты цэркваў Ратненскага дэканата. 1770(?) г.
5. APL. — Z. 95. — Sygn. 117. — Генеральныя візіты цэркваў Ратненскага дэканата. 1771 г.
6. APL. — Z. 95. — Sygn. 121. — Дэканскія візіты цэркваў Мельніцкага дэканата. 1774–1775 гг.
7. APL. — Z. 95. — Sygn. 129. — Генеральныя візіты цэркваў Ратненскага дэканата. 1792–1793 гг.
8. APL. — Z. 95. — Sygn. 143. — Генеральныя візіты цэркваў «Польска-Полацкай» епархіі. 1789–1790 гг. (часткі Полацкай архіепархіі, якая пасля 1772 г. засталася на тэрыторыі Рэчы Паспалітай).
9. APL. — Z. 95. — Sygn. 399. — Старажытныя дакументы аб фундушах царквы ў м. Межырэчча Мельніцкага пав. КП 1736, 1759, 1783, 1797, 1800 гг.
10. Biblioteka Narodowa w Warszawie. — Biblioteka Ordynacji Zamojskiej. — Dział rękopisów. — Sygn. 930. — k. 67 v–71. — Спіс усіх святароў Уладзімірска-Брэсцкай епархіі. 26.12.1729.
11. Buczyło A. Kształtowanie się sieci parafialnej Kościoła unickiego na terenie brzeskiej części diecezji włodzimierskiej w latach 1596–1795. Praca doktorska na kierunku historia. — Toruń, 2014. (У падрыхтоўцы.)
12. Buczyło A. Uniccy kapłani cerkwi w Koszołach do końca XVIII w. // Kniaża. Czasopismo mieszkańców wsi Koszoły. № 5. — 2013. — S. 6.
13. Dangel S. Rok 1831 w Mińszczyznie. — Warszawa, 1925. — 189 s.
14. Latvijas valsts vēstures arhīvs (далей LVVA). — F. 232. — Ap. 1. — L. 216. — Метрычныя кнігі аб народжаных, шлюбаваных і памерлых царквы ў в. Лаўдэры Люцынскага пав. 1835–1841 гг.
15. LVVA. — F. 232. — Ap. 1. — L. 379. — Метрычныя кнігі аб памерлых царквы ў м. Прыдруйск (сёння м. Піедруя) Дрысенскага пав. 1835–1841 гг.
16. LVVA. — F. 232. — Ap. 1. — L. 387. — Метрычныя кнігі аб народжаных царквы ў м. Прыдруйск (сёння м. Піедруя) Дрысенскага пав. 1835–1841 гг.
17. LVVA. — F. 232. — Ap. 1. — L. 517. — Метрычныя кнігі аб народжаных, шлюбаваных і памерлых цэркваў Курляндскага дэканата. 1833–1835 гг.
18. LVVA. — F. 232. — Ap. 1. — L. 591. — Метрычныя кнігі аб памерлых за 1828–1834 гг., аб народжаных, шлюбаваных і памерлых за 1835 гг. царквы ў в. Старая Слабада (сёння в. Вецслабада) Люцынскага пав.
19. LVVA. — F. 232. — Ap. 1. — L. 592. — Метрычныя кнігі аб памерлых царквы ў в. Старая Слабада (сёння в. Вецслабада) Люцынскага пав. 1836, 1839 гг.
20. LVVA. — F. 232. — Ap. 1. — L. 599. — Метрычныя кнігі аб шлюбаваных царквы ў в. Вертулова Люцынскага пав. 1835–1841 гг.
21. LVVA. — F. 232. — Ap. 1. — L. 602. — Метрычныя кнігі аб памерлых царквы ў в. Вертулова Люцынскага пав. 1835–1842 гг.
22. LVVA. — F. 232. — Ap. 1. — L. 689. — Метрычныя кнігі аб народжаных, шлюбаваных і памерлых цэркваў Курляндскага дэканата. 1836 г.
23. LVVA. — F. 232. — Ap. 1. — L. 694. — Метрычныя кнігі аб народжаных, шлюбаваных і памерлых Саланайскай царквы Зельбургскага пав. Курляндскай губ. 1835–1839 гг.
24. LVVA. — F. 232. — Ap. 2. — L. 66. — Метрычныя кнігі аб народжаных і шлюбаваных Якабштадцкага базыльянскага кляштара. 1700–1746 гг.
25. LVVA. — F. 232. — Ap. 2. — L. 79. — Метрычныя кнігі аб народжаных, шлюбаваных і памерлых цэркваў Курляндскага дэканата. 1814 г.
26. LVVA. — F. 232. — Ap. 2. — L. 81. — Метрычныя кнігі аб народжаных, шлюбаваных і памерлых цэркваў Курляндскага дэканата. 1820 г.
27. LVVA. — F. 232. — Ap. 2. — L. 82. — Метрычныя кнігі аб народжаных, шлюбаваных і памерлых цэркваў Курляндскага дэканата. 1824 г.
28. LVVA. — F. 232. — Ap. 2. — L. 83. — Метрычныя кнігі аб народжаных, шлюбаваных і памерлых цэркваў Курляндскага дэканата. 1828 г.
29. LVVA. — F. 232. — Ap. 2. — L. 84. — Метрычныя кнігі аб народжаных, шлюбаваных і памерлых цэркваў Курляндскага дэканата. 1829 г.
30. LVVA. — F. 630. — Ap. 2. — L. 280. — Рэвізскія сказкі ўніяцкіх святароў і царкоўнаслужыцеляў Зельбургскага пав. Курляндскай губ. 1834 г.
31. LVVA. — F. 7085. — Ap. 1. — L. 744. — Метрычныя кнігі аб народжаных царквы ў в. Лаўдэры Люцынскага пав. Віцебскай губ. 1776–1820 гг.
32. Lietuvos mokslų akademijos Vrublevskių biblioteka (далей LMAB). — Rankraščių skyrius. — F. 17. — Sygn. 155. — Дэканскія візіты цэркваў Падляшскага дэканата. 1773—1788 гг. Гл. таксама публікацыю гэтай крыніцы: *Księga wizyty dziekańskiej dekanatu podlaskiego przeze mnie księdza Bazylego Benedykta Guttorskiego dziekana podlaskiego, plebana golniewskiego w roku 1773 miesiąca Novembra dnia 17 iuxta vetus kalendarza sporządzona. — Opracowali Józef Mroszek, Waldemar F. Wilczewski. — Białystok, 1996. — 197 s.*

33. LMAB. — Rankraščių skyrius. — F. 17. — Sygn. 158. — Дэканскія візіты цэркваў Гродзенскага пав. 1814 г.

34. LMAB. — Rankraščių skyrius. — F. 17. — Sygn. 159. — Дэканскія візіты цэркваў Гродзенскага дэканата. 1818 г.

35. LMAB. — Rankraščių skyrius. — F. 41. — Sygn. 228–370. — Генеральныя візіты цэркваў Бельскага (цэнтр — м. Белая (сёння г. Бяла-Падляшская) Бельскага пав.), Бельскага (цэнтр — г. Бельск), Брэсцкага, Драгічынскага і Мельніцкага дэканатаў. 1759 г. (Гл. таксама другую частку матэрыялаў — пазіцыя 46).

36. Lietuvos valstybės istorijos archyvas (далей LVIA). — F. 447. — Ap. 4. — B. 1201. — Справа па іску страпчага Віленскай палаты дзяржаўных маёмасцей аб спрэчках паміж маёнткам Баніфацава землеўладальніка Беніслаўскага і маёнткам Рачуны Святлянскай царквы. 1855–1859 гг. (У справе маюцца арыгіналы і копіі дакументаў XVII–XVIII стст.)

37. LVIA. — F. 515. — Ap. 15. — B. 691. — Рэвізскія сказкі ўніяцкіх святароў і царкоўнаслужыцеляў Вілейскага пав. 1834 г.

38. LVIA. — F. 515. — Ap. 15. — B. 703. — Рэвізскія сказкі ўніяцкіх святароў і царкоўнаслужыцеляў Дзісенскага пав. 1834 г.

39. LVIA. — F. 525. — Ap. 8. — B. 1488. — Дакументы царквы ў м. Крывічы Ашмянскага пав. XVII–XIX стст.

40. LVIA. — F. 597. — Ap. 2. — B. 105. — Інвентар некаторых маёнткаў, што належалі пінска-тураўскім епіскапам. 1664–1787 гг.

41. LVIA. — F. 597. — Ap. 2. — B. 115. — L. 17. — Скарга пана Марціна Юскевіча ў Лагішынскі магістрат на збіццё яго святаром царквы ў м. Лагішын Пінскага пав. Янам Васінскім. 17.05.1723.

42. LVIA. — F. 597. — Ap. 2. — B. 123. — Выпісы з метрычных кніг розных цэркваў аб нараджэнні і пасведчанні аб заканчэнні навучальных устаноў рознымі святарамі. 1749–1787 гг.

43. LVIA. — F. 597. — Ap. 2. — B. 125. — Выпісы з метрычных кніг розных цэркваў аб нараджэнні і пасведчанні аб заканчэнні навучальных устаноў рознымі святарамі. 1754–1785 гг.

44. LVIA. — F. 605. — Ap. 7. — B. 5. — Інвентар царквы ў в. Савіцы Драгічынскага пав. КП. 12.01.1723.

45. LVIA. — F. 605. — Ap. 7. — B. 6. — Генеральная візіта царквы ў в. Трасцяніца Брэсцкага пав. 10.12.1725.

46. LVIA. — F. 634. — Ap. 1. — B. 48. — Генеральныя візіты цэркваў Камянецкага, Кобрынскага, Палескага, Пружанскага і Уладаўскага дэканатаў. 1759 г. (Гл. таксама другую частку матэрыялаў — пазіцыя 35).

47. LVIA. — F. 634. — Ap. 1. — B. 50. — Дэканскія візіты цэркваў Брэсцкага дэканата. 1757 г.

48. LVIA. — F. 634. — Ap. 1. — B. 51. — Дэканскія візіты цэркваў Бельскага дэканата. 1784 г.

49. LVIA. — F. 634. — Ap. 1. — B. 52. — Дэканскія візіты цэркваў Кобрынскага дэканата. 1784 г.

50. LVIA. — F. 634. — Ap. 1. — B. 53. — Генеральныя візіты цэркваў Лідскага і Слонімскага дэканатаў. 1784 г.

51. LVIA. — F. 634. — Ap. 1. — B. 55. — Генеральныя (1797–1798 гг.) і дэканскія (1799–1801 гг.) візіты цэркваў Бельскага, часткі Драгічынскага і Мельніцкага дэканатаў.

52. LVIA. — F. 634. — Ap. 1. — B. 56. — Генеральныя візіты цэркваў Кобрынскага дэканата. 1802 г.

53. LVIA. — F. 634. — Ap. 1. — B. 57. — Генеральныя візіты цэркваў Камянецкага дэканата. 1802 г.

54. LVIA. — F. 634. — Ap. 1. — B. 59. — Генеральныя візіты цэркваў Драгічынскага дэканата. 1804 г.

55. LVIA. — F. 634. — Ap. 1. — B. 60. — Генеральныя візіты цэркваў Беластоцкага і Навадворскага дэканатаў. 1804 г.; дэканскія візіты Беластоцкай і Дайлідскай цэркваў 1806 г. Гл. таксама публікацыю частак гэтай крыніцы: *Wizytacje cerkwi unickich dekanatu Nowodworskiego diecezji Supraskiej 1804 roku. Opracowali P. Borowik i G. Ryżewski. — Białystok, 2009. — 184 s.*, а таксама: *Księga wizyty dziekańskiej dekanatu podlaskiego przeze mnie księdza Bazylego Benedykta Guttorskiego dziekana podlaskiego, plebana golniewskiego w roku 1773 miesiąca Novembra dnia 17 iuxta vetus kalendarza sporządzona. Opracowali Józef Mroszek, Waldemar F. Wilczewski. — Białystok, 1996. — Aneks 1. — Wizytacja generalna unickiej cerkwi białostockiej przeprowadzona 25 listopada 1804 roku przez księdza Leona Kraskowskiego. — S. 143–156.*

56. LVIA. — F. 634. — Ap. 1. — B. 61. — Генеральныя візіты цэркваў Дзісенскага дэканата. 1819–1820 гг. (фрагмент. Асноўны комплекс дакументаў гл. пазіцыю 231).

57. LVIA. — F. 634. — Ap. 2. — B. 4. — Справа аб рукапалажэнні Пятра Трацэўскага ў сан святара (фрагмент. Гл. таксама пазіцыю 499).

58. LVIA. — F. 634. — Ap. 2. — B. 7. — Справа аб рукапалажэнні Яна Шаблоўскага ў сан святара.

59. LVIA. — F. 634. — Ap. 2. — B. 8. — Справа аб рукапалажэнні Іосіфа Паўлоўскага ў сан святара.

60. LVIA. — F. 634. — Ap. 2. — B. 9. — Справа аб рукапалажэнні Міхала Тарасевіча ў сан святара.

61. LVIA. — F. 634. — Ap. 2. — B. 16. — Справа аб рукапалажэнні Іосіфа Арэна ў сан святара.

62. LVIA. — F. 634. — Ap. 2. — B. 17. — Справа аб рукапалажэнні Юстына Бародзіча ў сан святара.

63. LVIA. — F. 634. — Ap. 2. — B. 18. — Справа аб рукапалажэнні Антона Вербіловіча ў сан святара.

64. LVIA. — F. 634. — Ap. 2. — B. 19. — Справа аб рукапалажэнні Яна Гамаліцкага ў сан святара.

65. LVIA. — F. 634. — Ap. 2. — B. 20. — Справа аб рукапалажэнні Тэадора Дэрынга ў сан святара.

66. LVIA. — F. 634. — Ap. 2. — B. 21. — Справа аб рукапалажэнні Рамана Карвоўскага ў сан святара.

67. LVIA. — F. 634. — Ap. 2. — B. 22. — Справа аб рукапалажэнні Антона Ляскоўскага ў сан святара.

68. LVIA. — F. 634. — Ap. 2. — B. 23. — Справа аб рукапалажэнні Караля Пятроўскага ў сан святара.

69. LVIA. — F. 634. — Ap. 2. — B. 24. — Справа аб рукапалажэнні Сымона Ральцэвіча ў сан святара.

70. LVIA. — F. 634. — Ap. 2. — B. 25. — Справа аб рукапалажэнні Сымона Сушчынскага ў сан святара.

71. LVIA. — F. 634. — Ap. 2. — B. 26. — Справа аб рукапалажэнні Тадэвуша Шостака ў сан святара.

72. LVIA. — F. 634. — Ap. 2. — B. 27. — Справа аб рукапалажэнні Сымона Турчыновіча ў сан святара.

73. LVIA. — F. 634. — Ap. 2. — B. 28. — Справа аб рукапалажэнні Яна Шалепіна ў сан святара.

74. LVIA. — F. 634. — Ap. 2. — B. 61. — Справа аб рукапалажэнні Баніфація Каранеўскага ў сан святара.

75. LVIA. — F. 634. — Ap. 2. — B. 88. — Справа аб рукапалажэнні Марціна Андраеўскага ў сан святара.

76. LVIA. — F. 634. — Ap. 2. — B. 89. — Справа аб рукапалажэнні Станіслава Барташэвіча ў сан святара.
77. LVIA. — F. 634. — Ap. 2. — B. 90. — Справа аб рукапалажэнні Якуба Бычкоўскага ў сан святара.
78. LVIA. — F. 634. — Ap. 2. — B. 91. — Справа аб рукапалажэнні Мікалая Верыкоўскага ў сан святара.
79. LVIA. — F. 634. — Ap. 2. — B. 92. — Справа аб рукапалажэнні Стэфана Дзенісевіча ў сан святара.
80. LVIA. — F. 634. — Ap. 2. — B. 93. — Справа аб рукапалажэнні Іосіфа Зубовіча ў сан святара.
81. LVIA. — F. 634. — Ap. 2. — B. 94. — Справа аб рукапалажэнні Яна Клімантовіча ў сан святара.
82. LVIA. — F. 634. — Ap. 2. — B. 95. — Справа аб рукапалажэнні Васіля Манькоўскага ў сан святара.
83. LVIA. — F. 634. — Ap. 2. — B. 96. — Справа аб рукапалажэнні Адама Рэцкага ў сан святара.
84. LVIA. — F. 634. — Ap. 2. — B. 97. — Справа аб рукапалажэнні Алаіза Юрэвіча ў сан святара.
85. LVIA. — F. 634. — Ap. 2. — B. 121. — Справа аб маёмасных прэтэнзіях святарскай удавы Б. Хруцкай да святара Г. Вусакоўскага.
86. LVIA. — F. 634. — Ap. 2. — B. 128. — Справа аб рукапалажэнні Каятана Беліновіча ў сан святара.
87. LVIA. — F. 634. — Ap. 2. — B. 129. — Справа аб рукапалажэнні Яна Балевіча ў сан святара.
88. LVIA. — F. 634. — Ap. 2. — B. 130. — Справа аб рукапалажэнні Францішка Гласкі ў сан святара.
89. LVIA. — F. 634. — Ap. 2. — B. 131. — Справа аб рукапалажэнні Іосіфа Яленскага ў сан святара.
90. LVIA. — F. 634. — Ap. 2. — B. 132. — Справа аб рукапалажэнні Бенедыкта Кляеўскага ў сан святара.
91. LVIA. — F. 634. — Ap. 2. — B. 133. — Справа аб рукапалажэнні Ігната Кульвеца ў сан святара.
92. LVIA. — F. 634. — Ap. 2. — B. 134. — Справа аб рукапалажэнні Іосіфа Лаўроўскага ў сан святара.
93. LVIA. — F. 634. — Ap. 2. — B. 135. — Справа аб рукапалажэнні Андрэя Мацкевіча ў сан святара.
94. LVIA. — F. 634. — Ap. 2. — B. 136. — Справа аб рукапалажэнні Стэфана Асоўскага ў сан святара.
95. LVIA. — F. 634. — Ap. 2. — B. 137. — Справа аб рукапалажэнні Антона Паўлоўскага ў сан святара.
96. LVIA. — F. 634. — Ap. 2. — B. 138. — Справа аб рукапалажэнні Лукаша Фалевіча ў сан святара.
97. LVIA. — F. 634. — Ap. 2. — B. 139. — Справа аб рукапалажэнні Яна Пякарскага ў сан святара.
98. LVIA. — F. 634. — Ap. 2. — B. 153. — Справа аб рукапалажэнні Яна Гамаліцкага ў сан святара.
99. LVIA. — F. 634. — Ap. 2. — B. 155. — Справа аб рукапалажэнні Баніфацыя Мажэйкі ў сан святара.
100. LVIA. — F. 634. — Ap. 2. — B. 156. — Справа аб рукапалажэнні Сільвестра Пятрашкі ў сан святара.
101. LVIA. — F. 634. — Ap. 2. — B. 157. — Справа аб рукапалажэнні Гаўрыіла Сарокі ў сан святара.
102. LVIA. — F. 634. — Ap. 2. — B. 158. — Справа аб рукапалажэнні Іосіфа Юрэвіча ў сан святара.
103. LVIA. — F. 634. — Ap. 2. — B. 166. — Справа аб рукапалажэнні Тэафіла Ваяводскага ў сан святара.
104. LVIA. — F. 634. — Ap. 2. — B. 168. — Справа аб рукапалажэнні Якуба Герасімовіча ў сан святара.
105. LVIA. — F. 634. — Ap. 2. — B. 192. — Справа аб рукапалажэнні Якуба Андраеўскага ў сан святара.
106. LVIA. — F. 634. — Ap. 2. — B. 193. — Справа аб рукапалажэнні Казіміра Дылеўскага ў сан святара.
107. LVIA. — F. 634. — Ap. 2. — B. 203. — Справа аб рукапалажэнні Мікалая Касперскага ў сан святара.
108. LVIA. — F. 634. — Ap. 2. — B. 204. — Справа аб рукапалажэнні Стэфана Сушчынскага ў сан святара.
109. LVIA. — F. 634. — Ap. 2. — B. 205. — Справа аб рукапалажэнні Дамініка Трыдэнскага ў сан святара.
110. LVIA. — F. 634. — Ap. 2. — B. 228. — Справа аб рукапалажэнні Гаўрыіла Трыдэнскага ў сан святара.
111. LVIA. — F. 634. — Ap. 2. — B. 229. — Справа аб рукапалажэнні Рафаіла Тамаровіча ў сан святара.
112. LVIA. — F. 634. — Ap. 2. — B. 240. — Справа па абвінавачванні святара Г. Вусакоўскага ў крадзяжы брацкіх грошаў.
113. LVIA. — F. 634. — Ap. 2. — B. 269. — Справа аб рукапалажэнні Піліпа Мацкевіча ў сан святара.
114. LVIA. — F. 634. — Ap. 2. — B. 270. — Справа аб рукапалажэнні Юстына Пчолкі ў сан святара.
115. LVIA. — F. 634. — Ap. 2. — B. 271. — Справа аб рукапалажэнні Дамініка Ральцэвіча ў сан святара.
116. LVIA. — F. 634. — Ap. 2. — B. 272. — Справа аб рукапалажэнні Яна Сніткі ў сан святара.
117. LVIA. — F. 634. — Ap. 2. — B. 273. — Справа аб рукапалажэнні Фларыяна Тамашэўскага ў сан святара.
118. LVIA. — F. 634. — Ap. 2. — B. 274. — Справа аб рукапалажэнні Канстанціна Трацэўскага ў сан святара.
119. LVIA. — F. 634. — Ap. 2. — B. 289. — Справа аб рукапалажэнні Ксаверыя Гамаліцкага ў сан святара.
120. LVIA. — F. 634. — Ap. 2. — B. 316. — Справа аб рукапалажэнні Тадэвуша Адамовіча ў сан святара.
121. LVIA. — F. 634. — Ap. 2. — B. 317. — Справа аб рукапалажэнні Паўла Беліновіча ў сан святара.
122. LVIA. — F. 634. — Ap. 2. — B. 318. — Справа аб рукапалажэнні Ігната Вербіловіча ў сан святара.
123. LVIA. — F. 634. — Ap. 2. — B. 319. — Справа аб рукапалажэнні Францішка Карніловіча ў сан святара.
124. LVIA. — F. 634. — Ap. 2. — B. 320. — Справа аб рукапалажэнні Яна Кіршэўскага ў сан святара.
125. LVIA. — F. 634. — Ap. 2. — B. 619. — Справа аб рукапалажэнні Гаўрыіла Вусакоўскага ў сан святара.
126. LVIA. — F. 634. — Ap. 2. — B. 699. — Генеральныя візіты цэркваў Ігуменскага дэканата. 1766 г. (Фрагмент. Другі фрагмент гл. пазіцыю 366).
127. LVIA. — F. 634. — Ap. 3. — B. 11. — Апісанне царквы ў м. Перабраддзе Браслаўскага пав. 22.04.1736.
128. LVIA. — F. 634. — Ap. 3. — B. 16. — Сыходзячыя дакументы мітрапаліта Ф.-П. Валадковіча. 1762–1778 гг.
129. LVIA. — F. 634. — Ap. 3. — B. 21. — Спіс парафіянаў царквы ў в. Беркаўшчына Ашмянскага пав. 26.05.1766.
130. LVIA. — F. 634. — Ap. 3. — B. 28. — Стаўленая грамата пінска-тураўскага епіскапа Г. Дашковіча-Гарбацкага Т. Вашчыловічу на пасаду святара цэркваў у в. Вашкевічы і Дакудава Лідскага пав. 19.07.1778.
131. LVIA. — F. 634. — Ap. 3. — B. 31. — Рапарты адміністратара царквы ў в. Патапавічы Пінскага пав. Ц. Тарановіча і вікарыя царквы ў в. Кротава Пінскага пав. К. Абрамовіча аб перамяшчэннях па службе. Канец 1780-х гг.

132. LVIA. — F. 634. — Ap. 3. — B. 42. — Справа аб рукапалажэнні Марціна Малевіча, Тамаша Арцімовіча, Пятра Славікоўскага, Яна Колба-Сялецкага, Яна Ненадкевіча, Данііла Юхневіча, Стэфана Навіцкага, Яўхіма Касакоўскага, Міхала Станкевіча ў сан святара.

133. LVIA. — F. 634. — Ap. 3. — B. 83. — Прэзента віленскага ваяводы Міхала-Казіміра Радзівіла Ануфрыю Ясінскаму на пасаду святара царквы ў м. Орля Лідскага пав. 22.07.1793.

134. LVIA. — F. 634. — Ap. 3. — B. 113. — Пастанова палкоўніка Вялікага Княства Літоўскага Гіяцынта Косця аб публічным знішчэнні «бунтарскага маніфесту» брацтва Св. Пятра і Паўла ў м. Друя Браслаўскага пав. 08.01.1785.

135. LVIA. — F. 634. — Ap. 3. — B. 144. — Арк. 166, 569 — 569 адв. — Спісы святароў Слонімскага дэканата 1800 г. і Лідскага дэканата. 1795 г.

136. LVIA. — F. 634. — Ap. 3. — B. 146. — Дэканскія візіты цэркваў Брэсцкага дэканата. 1773 г.

137. LVIA. — F. 634. — Ap. 3. — B. 148. — Акты, лісты і дакументы па розных пытаннях да 1795 г.

138. LVIA. — F. 634. — Ap. 3. — B. 156. — Спіс святароў Гродзенскага, Бездзежскага, Камянецкага і Палескага дэканатаў. 1800 г.

139. LVIA. — F. 634. — Ap. 3. — B. 270. — Рэвізскія сказкі, «што засталіся ад пажару кансісторыі», уніяцкіх святароў і царкоўнаслужыцеляў Слонімскага пав. 1811 г.

140. LVIA. — F. 634. — Ap. 3. — B. 337. — Пасямейныя спісы святароў Брэсцкага дэканата. 1823 г.

141. LVIA. — F. 634. — Ap. 3. — B. 379. — Пасямейныя спісы бязмесцавых святароў Мінскай губ. 1799 г.

142. LVIA. — F. 634. — Ap. 3. — B. 400. — Дэканскія візіты цэркваў Мінскага дэканата. 1777 г.

143. LVIA. — F. 634. — Ap. 3. — B. 411. — Спіс архімандрытаў, членаў кансісторый, сурагацый, кіраўніцтва дэканатаў уніяцкай царквы Мінскай губ. 28.04.1798; спіс уніяцкіх святароў Мінскай губ. 05.05.1798.

144. LVIA. — F. 634. — Ap. 3. — B. 415. — Экстракты дэканскай візіты цэркваў Мазырскага дэканата. 1801 г.

145. LVIA. — F. 634. — Ap. 3. — B. 515. — Падаўчы інвентар царквы ў м. Халопенічы Аршанскага пав. 24.04.1783.

146. LVIA. — F. 634. — Ap. 3. — B. 592. — Матэрыялы (прывілеі каралёў, інвентары, дарчыя запісы, лісты куплі-продажу, пастановы судоў, перапіска аб спрэчных маёмасна-фінансавых і іншых пытаннях і інш.), якія тычацца Пінскага кляштара базыльянак. 1560–1813 гг.

147. Rodzina. Herbarz szlachty polskiej. Opracowany przez Seweryna Hrabiego Uruskiego przy współudziale Adama Amilkara Kosińskiego, wykończony i uzupełniony przez Aleksandra Włodarskiego, wydane staraniem córek autora. — Tom VIII. — Warszawa, 1911.

148. Rodzina. Herbarz szlachty polskiej. Ze zbiorów Seweryna Hr. Uruskiego i materjałów archiwalnych. Opracowany przez Aleksandra Włodarskiego. — Tom XV. — Warszawa, 1931.

149. Wołyniak (Giżycki J.). Szkoła powiatowa bazyliańska w Wilnie // Przegląd powszechny. — Tom XL. — Kraków: Druk Wł. Ł. Anczyca i Spółki pod zarządem Jana Gadowskiego, 1893. — S. 93–109.

150. Wołyniak (Giżycki J.). Unici w Kurlandyi // Przegląd powszechny. — Tom XLIII. — Kraków: Druk Wł. Ł. Anczyca i Spółki pod zarządem Jana Gadowskiego, 1894. — S. 199–223.

151. Акты, издаваемые Виленскою археографическою комиссиею. — Т. III. — Акты Брестскаго гродскаго суда. — Вильня: в типографии Губернскаго Правления, 1870.

152. АВАК. — Т. XXXIII. — Вильна, 1908.

153. Археографический сборник документов, относящихся к истории Северозападной Руси, издаваемый при Управлении Виленскаго Учебнаго Округа. Т. 13. Вильна: Типография А. Г. Сыркина, 1902. — XXXVI + 235 с.

154. Археографический сборник документов, относящихся к истории Северозападной Руси, издаваемый при Управлении Виленскаго Учебнаго Округа. Т. 14. Вильна: Типография А. Г. Сыркина, 1904. — LXI + 228 с.

155. Архіў Мінскай духоўнай Акадэміі і Семінарыі (в. Жыровічы Слонімскага р-на Гродзенскай вобл.) (далей АМДАС). — Ф. 1. — Воп. 1. — Спр. 2. — Указы Брэсцкай уніяцкай духоўнай кансісторыі лідскаму дэкану. 1817 г.

156. АМДАС. — Ф. 1. — Воп. 1. — Спр. 3. — Указы Брэсцкай уніяцкай духоўнай кансісторыі лідскаму дэкану. 1821 г.

157. АМДАС. — Ф. 1. — Воп. 1. — Спр. 4. — Указы Брэсцкай уніяцкай духоўнай кансісторыі лідскаму дэкану, уваходзячая і сыходзячая карэспандэнцыя лідскага дэкана. 1821–1836 гг.

158. АМДАС. — Ф. 1. — Воп. 1. — Спр. 5. — Указы Брэсцкай уніяцкай духоўнай кансісторыі лідскаму дэкану, уваходзячая і сыходзячая карэспандэнцыя лідскага дэкана. 1823 г.

159. АМДАС. — Ф. 1. — Воп. 1. — Спр. 6. — Указы Брэсцкай уніяцкай духоўнай кансісторыі лідскаму дэкану, уваходзячая і сыходзячая карэспандэнцыя лідскага дэкана. 1825 г.

160. АМДАС. — Ф. 1. — Воп. 1. — Спр. 7. — Указы Брэсцкай уніяцкай духоўнай кансісторыі лідскаму дэкану, уваходзячая і сыходзячая карэспандэнцыя лідскага дэкана. 1826–1827 гг.

161. АМДАС. — Ф. 1. — Воп. 1. — Спр. 8. — Указы Брэсцкай уніяцкай духоўнай кансісторыі лідскаму дэкану, уваходзячая і сыходзячая карэспандэнцыя лідскага дэкана. 1827 г.

162. АМДАС. — Ф. 1. — Воп. 1. — Спр. 9. — Указы Брэсцкай уніяцкай духоўнай кансісторыі лідскаму дэкану, уваходзячая і сыходзячая карэспандэнцыя лідскага дэкана. 1828 г.

163. Архіў царквы ў м. Ракаў (сёння в. Ракаў Валожынскага р-на Мінскай вобл.) (далей АЦР). — Воп. 1. — Спр. 3. — Генеральныя візіты цэркваў Мінскага дэканата. 1799 г.

164. АЦР. — Воп. 1. — Спр. 4. — Падаўчыя інвентары і дэканскія візіты цэркваў Даўгінаўскага дэканата. 1764–1776 гг.; запіс ігуменскага дэкана В. Вярыгі-Дарэўскага аб асвячэнні філіяльнай царквы ў в. Сычэвічы Мінскага пав., прыпісанай да царквы ў м. Радашковічы Мінскага пав. 06.06.1783.

165. АЦР. — Воп. 1. — Спр. 5. — Дэканскія візіты цэркваў Ігуменскага дэканата. 1776–1783 гг.

166. АЦР. — Воп. 1. — Спр. 6. — Падаўчыя інвентары цэркваў Мінскага дэканата. 1801–1823 гг.

167. АЦР. — Воп. 1. — Спр. 7. — Дэканскія візіты цэркваў Мінскага дэканата. 1801 г.

168. АЦР. — Воп. 1. — Спр. 8. — Дэканскія візіты цэркваў Мінскага дэканата. 1811 г.

169. АЦР. — Воп. 1. — Спр. 10. — Дэканскія візіты цэркваў Мінскага дэканата. 1815–1819 гг.

170. АЦР. — Воп. 1. — Спр. 14. — Інвентар царквы ў в. Прылепы Мінскага пав. 14.07.1808.

171. АЦР. — Воп. 1. — Спр. 15. — Інвентар царквы ў в. Прылепы Мінскага пав. 15.09.1810.

172. АЦР. — Воп. 1. — Спр. 16. — Інвентары царквы ў в. Сенніца Мінскага пав. 1835—1836 гг.

173. Брэсцкая абласная бібліятэка імя М. Горкага. — Аддзел рукапісаў. — Інвентары заступлення на пасаду Вальнянскіх настаяцелей, складзеныя ад 1675 году да 1782 году. Дакументы царквы ў в. Чэрніхава Навагрудскага пав. 1752–1826 гг.

174. Великие художники. — Т. 31. — Иван Фомич Хруцкий. — М., 2010. — 47 с.

175. Evаггеліе. — Пачаеў, 1780. (Інскрыпцыі на палях асобніка, які захоўваецца ў бібліятэцы НГМРБ. Шыфр КП 40235.)

176. Историко-юридические материалы, извлеченные из актовых книг губерний Витебской и Могилевской, хранящихся в центральном архиве в Витебске, изданные под редакциею архивариуса сего архива А. Созонова (далей — ИЮМ). — Вып. 6. — Витебск, 1874.

177. ИЮМ. — Вып. 18. — Витебск, 1888.

178. ИЮМ. — Вып. 19. — Витебск, 1889.

179. ИЮМ. — Вып. 28. — Витебск, 1900.

180. [Кішка, Л.] Собраніе припадковъ краткое, и духовнымъ особомъ потребное. Имѹщее в себѣ Naѹкѹ о Сакраментахъ, о десѧти Божїихъ Приказанѧхъ, о Приказанѧхъ Церковныхъ, и о Naѹцѣ Христїанской, съ выкладомъ Сѵмвола или Исповѣданїѧ Вѣры Православныѧ Каѳолическїѧ, съ выкладомъ Молитвы: Отче нашъ: и Богородице Дево: Такожде Naѹкѹ, како подобаетъ наставлѧти малыхъ или невѣжовъ в Вѣры Православной, содержащее / [Л. Кішка]. — Супрасль, 1722. — 224 с. (Інскрыпцыі на старонках асобніка, які захоўваецца ў LMAB, шыфр № R-18/301.)

181. [Кішка, Л.] Собраніе припадковъ краткое… Інскрыпцыі на старонках асобніка, які захоўваецца ў бібліятэцы НГМРБ, шыфр № 528.)

182. Лабынцаў Ю. А. Баброўскі Міхаіл Кірылавіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т. Т. 1. А — Беліца / Беларус. Энцыкл.; рэдкал.: М. В. Біч і інш.; Прадм. М. Ткачова; маст. Э. Э. Жакевіч. — Мн.: БелЭн, 1993. — С. 248–249.

183. Литовские епархиальные ведомости. — 1878. № 4.

184. Минская старина. Труды Минского церковного историко-археологического комитета. — Вып. 2. — Мн.,1911.

185. Минские епархиальные ведомости (далей МЕВ). — 1871. № 15.

186. МЕВ. — 1871. № 51.

187. МЕВ. — 1871. № 52.

188. МЕВ. — 1874. № 4.

189. МЕВ. — 1874. № 15.

190. МЕВ. — 1875. № 23.

191. Мосейчук Л. И. Главная виленская духовная семинария (1808–1832 гг.): основные направления деятельности и личный состав учащихся. (У друку.)

192. Мяцельскі А. А. Мсціслаўскае княства і ваяводства ў XII–XVIII стст. — Мінск: Беларуская навука, 2010. — 664 с.: іл.

193. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей НГАБ). — КМФ 18. — Спр. 72. — «Метрика привилев, данин и потвержений короля Стефана». Кніга пісара Габрыэля Войны. 1585–1589 гг.

194. НГАБ. — КМФ 18. — Спр. 100. — «Метрыка ВКЛ за караля Зыгмунда III, у якой прывілеі, даніны, фундушы, пацверджанні, арэнды, кантракты і іншыя справы за падканцлерства Паўла Сапегі». 1623–1626 гг.

195. НГАБ. — Ф. 117. — Воп. 1. — Спр. 1. — Генеральныя і дэканскія візіты царквы ў м. Юр'ева Мінскага (пасля Барысаўскага) пав. 1791–1826 гг.

196. НГАБ. — Ф. 117. — Воп. 1. — Спр. 2. — Генеральныя і дэканскія візіты царквы ў м. Юр'ева Барысаўскага пав. 1834–1859 гг.

197. НГАБ. — Ф. 118. — Воп. 1. — Спр. 2. — Генеральныя і дэканскія візіты царквы ў в. Мсціж Мінскага (пасля Барысаўскага) пав. 1784–1842 гг.

198. НГАБ. — Ф. 128. — Воп. 1. — Спр. 1. — Генеральныя і дэканскія візіты царквы ў в. Буцэвічы Мінскага пав. 1773–1819 гг.

199. НГАБ. — Ф. 128. — Воп. 1. — Спр. 2. — Генеральныя і дэканскія візіты царквы ў в. Буцэвічы Мінскага пав. 1820–1840 гг.

200. НГАБ. — Ф. 136. — Воп. 1. — Спр. 65. — Справа аб перадачы з Магілёўскай праваслаўнай духоўнай кансісторыі дакументаў цэркваў і манастыроў, якія перайшлі ў падпарадкаванне Пераяслаўскага і Барыспольскага епіскапа Віктара (Садкоўскага). 1786 г. Спіс цэркваў і кляштараў на тэрыторыі Магілёўскай праваслаўнай епархіі, пераведзеных ва ўніяцтва. 13.06.1754.

201. НГАБ. — Ф. 136. — Воп. 1. — Спр. 2911. — Справа па абвінавачванні святара царквы ў в. Сморкі Барысаўскага пав. С. Багданоўскага ў пастрыжэнні барады і валасоў у час франка-расійскай вайны. 1813 г.

202. НГАБ. — Ф. 136. — Воп. 1. — Спр. 3788. — Справа па прашэнні адміністратара ўніяцкай царквы ў м. Тумілавічы Барысаўскага пав. А. Ляскоўскага аб прыняцці праваслаўя. 1815–1816 гг.

203. НГАБ. — Ф. 136. — Воп. 1. — Спр. 5207. — Справа паводле рапарта дзячка царквы Св. Тройцы ў м. Ельск Мазырскага пав. В. Варанца аб правядзенні набажэнстваў бязмесцавым уніяцкім святаром А. Варсобам. 1819–1820 гг.

204. НГАБ. — Ф. 136. — Воп. 1. — Спр. 7702. — Справа паводле спрэчкі паміж святаром царквы Ператварэння Божага ў в. Столін Пінскага пав. і памешчыкам Солтанам аб праве валодання ўчасткам фундушовай зямлі. 1827 г.; Візіты царквы Ператварэння Божага ў в. Столін Пінскага пав. 1772, 1787, 1793 гг.

205. НГАБ. — Ф. 136. — Воп. 1. — Спр. 9237. — Справа паводле прашэння сына ўніяцкага дзячка А. Русецкага аб прыняцці яго ў духоўнае званне і прызначэнні панамаром царквы ў в. Чэрнін Бабруйскага пав. 1832–1836 гг.

206. НГАБ. — Ф. 136. — Воп. 1. — Спр. 10138. — Арк. 40. — Стаўленая грамата Ф. Тарановіча на пасаду святара царквы ў в. Жоўкіна Пінскага пав. 07.09.1833.

